Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Універсітэт у Беластоку ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 26 (2668) Год LII Беласток, 1 ліпеня 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Добры дзень, PANIE Бургомістр

Такімі словамі ў хуткім часе жыхары Гайнаўкі будуць мець магчымасць звяртацца да чыноўнікаў самаўрадавай адміністрацыі горада. На беларускай мове павінны яны атрымаць тлумачэнні ў сваіх справах. На прашэнні, напісаныя па-беларуску, павінны таксама атрымаць адказы на беларускай мове. Рада горада 21 чэрвеня прыняла пастанову аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з чыноўнікамі ў адпаведнасці з законам аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове, прынятым Сеймам 6 студзеня 2005 года. Каб пражываючыя ў Гайнаўцы беларусы маглі карыстацца сваімі прывілеямі, патрэбная яшчэ згода і рэгістрацыя дапаможнай мовы ў Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, што раней зрабілі жыхары 16 гмін у Польшчы, дзе кампактна пражываюць немцы, літоўцы і кашубы.

За пастановай аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з гайнаўскімі чыноўнікамі прагаласавалі радныя ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта (трох справа) і частка Самаўрадавага паразумення Гайнаўскага павета (сядзяць далей).

Пераадолелі складанасці

Ва ўсіх камісіях Гарадской рады праект пастановы аб увядзенні дапаможнай мовы быў станоўча ацэнены і рэкамендаваны радным для прыняцця і хіба ні жыхары Гайнаўкі, ні журналісты, сабраныя на сесіі не прадбачвалі, што дыскусія над праектам будзе такой доўгай, а яго лёсы такімі няпэўнымі. Ужо ў час прымання парадку працы Рады радны Яўген Балтрамюк **(чыт. стар. 12)**, выбраны ад Самаўрадавага паразумення Гайнаўскага павета, прапанаваў зняць праект пастановы з павесткі дня, але ў галасаванні ягоная прапанова не атрымала дастатковай падтрымкі. Яўген Балтрамюк перасцерагаў, што разгляданая пастанова падзеліць грамадства і завострыць нацыянальныя і канфесійныя антаганізмы, але радныя ад ПіС і Грамадзянскай платформы заявралі, што ніякіх антаганізмаў у горадзе няма, а суадносіны паміж жыхарамі Гайнаўкі складваюцца вельмі добра.

Ініцыятыва ўвядзення беларускай мовы як дапаможнай у кантактах з гайнаўскімі чыноўнікамі выйшла ад радных Беларуска-народнага выбарчага камітэта і гэта яны пераконвалі іншых радных падтрымаць прапанову. У час сесіі радныя ад БНВК мусілі адказваць на закіды радных ад ПіС, ГП і Яўгена Балтрамюка ў адрас праекта пастановы. Радныя ад ПіС, адмоўна ацэньваючы праект пастановы, спасылаліся нават на русіфікацыю польскага насельніцтва ў мінулым і перасцерагалі, што можа здзейсніцца тое, чаго не дакончыў цар. Намеснік старшыні Рады Яўген Сачко (выступаў ад БНВК) здзіўляўся, што рэалізацыя разгляданай пастановы можа пагражаць незалежнасці Польшчы, а радны Віктар Дзік (таксама ад БНВК) пераконваў, што гайнаўскія беларусы не будуць выступаць за далучэнне горада да Беларусі.

Перад галасаваннем над пастановай радны Балтрамюк выйшаў з чарговай прапановай адтэрмінаваць разгляд праекта і галасаванне над ім на іншую сесію, але і на гэты раз яго ініцыятыва не знайшла дастатковай падтрымкі ў Радзе горада. У канчатковым галасаванні над праектам пастановы падтрымалі яго ўсе радныя ад БНВК (6 асоб) і 3 радных ад Самаўрадавага паразумення Гайнаўскага павета (2 асобы ад яго стрымаліся ад галасавання), чаго хапіла, каб прыняць пастанову. Супраць яе галасавалі ўсе радныя ад ПіС (4 асобы), ГП (3 асобы) і радны Балтрамюк (атрымалася 9 галасоў за і 8 супраць).

Паставіць на сваю мову

У час сесіі ставіліся пытанні наконт карысцяў, якія гораду прынясе ўвядзенне беларускай мовы як дапаможнай у гайнаўскай самаўрадавай адміністрацыі. Я думаю, што самая вялікая карысць гэта свядомасць, што можна на практыцы выкарыстоўваць родную мову ў кантактах з чыноўнікамі. Калі жыхары Гайнаўкі змогуць афіцыйна гаварыць па-беларуску ў магістраце, то тым болей не павінны саромецца гаварыць па-свойму і ў іншых публічных месцах горада. Напэўна ўзрасце прэстыж навучання беларускай мовы ва ўсіх гайнаўскіх школах, бо вядома будзе, што веданне роднай мовы гэта козыр у будучыні, калі нехта пасля атрымання адукацыі ў вышэйшай установе вернецца ў Гайнаўку і схоча шукаць работу ў самаўрадавай адміністрацыі. Радны Яўген Сачко заўважыў, што розгалас, які дае ўвядзенне дапаможнай мовы можа толькі прыцягнуць турыстаў у горад, а не яму зашкодзіць. Нашы людзі, як і радныя, якія выбіраліся з іх ліку, маюць у натуры асцярожнасць, а жыхары сёл звыкліся перад прыманнем важнага рашэння паглядзець як ставяцца да сур'ёзных спраў адукаваныя людзі на важных пасадах. Калі за пастановай прагаласавалі гайнаўскія дырэктары і настаўнікі, прадстаўнікі лекарскага і інжынерскага асяроддзяў ёсць надзея, што іх следам пойдуць радныя з вясковых гмін Гайнаўшчыны і Бельшчыны, у якіх у час перапісу насельніцтва больш за 20% людзей назвала сябе беларусамі.

За ўвядзенне пастановы хадайнічалі намеснікі старшыні Рады Яўген Сачко (стаіць) і Пётр Маркевіч (сядзіць справа, пасярэдзіне — старшыня Рады Леонард Кульваноўскі)

Радныя БНВК выступілі таксама з прапановай законапраекта ў справе змяшчэння на ўказальніках, распаложаных на акраінах горада, двухмоўных назваў Гайнаўкі, на польскай і беларускай мовах. Аднак перад галасаваннем на сесіі ў гэтай справе павінна быць праведзенае апытанне рэпрэзентатыўнай часткі жыхароў горада і ідэю павінна падтрымаць прынамсі 50% апытаных грамадзян.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Усеагульная палітызацыя

☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Сустрэў я неяк аднаго знаёмага таксіста. Хлопец ад палітыкі далёкі і заангажаваны толькі тым, каб сумленнай і руплівай працай зарабіць як мага больш грошай для сваёй, гэтакай жа апалітычнай сям'і. Моўчкі вытрымліваў ён падвышэнне падаткаў і ўсё новыя патрабаванні да касавых апаратаў і стану машыны, і стабільна растучыя кошты ў крамах і ўсе іншыя нязручнасці ды навалы. Лічыў, што калі ён сумленны, чэсны ды рахманы, то пражыве са сваёй працы, спакойна і бясслаўна памрэ, пакінуўшы ў спадчыну сваім дзецям такое ж шэрае і нуднае, але без палітычных клопатаў жыццё...

Ару сам і сею сам

☞ 3

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„**Ніва**" *(пасля гадзіны ад дамоўленага часу сустрэчы)*: ***— Вы часта даводзіце да таго, што Вас трэба чакаць?***

Мікола Яноўскі (беларус па паходжанні, член Падляшскай управы ад ПСЛ, кааліцыянта галоўнай кіруючай ваяводствам партыі ПіС, адказны галоўным чынам за сельскую гаспадарку): — Сардэчна прашу ў вас прабачэнння. Ды гэта толькі трэці тыдзень як я тут займаюся. Толькі што азнаямляюся з працай. Вы мусілі мяне пачакаць, бо якраз я меў сустрэчу на тэму заснавання дапаможнай адзінкі па справах аб'ядноўвання грунтаў. Былі тут у мяне геадэзісты. Хочам стварыць гэтую ўстанову, каб не ўцякалі нам грошы...

Любяць сваю мову

☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Хаця колькасць вучняў у Падставовай школе і Публічнай гімназіі ў Нарве скарачаецца, лік навучэнцаў беларускай мовы ў абедзвюх школах, якія змяшчаюцца ў адным вялікім будынку, павялічваецца. Зараз беларускай мове вучыцца 126 школьнікаў, якія вельмі ахвотна ўдзельнічаюць у беларускамоўных конкурсах і часта ў іх перамагаюць. Ахвярная работа настаўніцы беларускай мовы Ніны Абрамюк дае вельмі добрыя рэзультаты...

Вёска з (к)раю

☞ 11

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У Валілы заглядаю ў летні спякотны дзень, калі здаецца, што наша Сонейка асабліва шчыра дорыць нам багатую долю ад сваіх распаленых градусаў. Быццам у высокай стратасферы нехта павесіў над вёскай выпуклую лінзу, якая тых градусаў збірае яшчэ больш, чым належыцца з высокіх высот. А на вуліцы, калі б хто паклаў на яе белую фарбу, насціл выглядаў бы як у сіверную зіму, ачышчаны магутным адвалам ад снегу — такая менавіта фактура вулічнага палатна адкрылася перада мною...

9 770546 196000

Усеагульная палітызацыя

Выказванне пра тое, што калі ты не займаешся палітыкай, то палітыка зоймецца табой, настолькі старое і зацёртае, што ў большасці выпадкаў у нас успрымаецца як пустая і не маючая аніякага сэнсу фраза. Маўляў, можа дзе-небудзь яна і актуальная, але не ў Беларусі, бо дзяржаўныя органы якраз цікавяцца менавіта тымі людзьмі і структурамі, што лезуць не ў сваю справу, якая і называецца палітыка. А тыя людзі, што не спяшаюцца сунуць нос у сферу неафіцыйна забароненых для простага смяротнага беларуса дзеяў, нібыта жывуць хоць і не надта заможна і вольна, але без нікому непатрэбных клопатаў і праблемаў. На жаль, гэтая думка агульнараспаўсюджаная і, мажліва, прыжылася яна не без дапамогі адпаведных дзяржаўных службаў, якія ў спадчыну ад сваіх савецкіх правобразаў атрымалі і ўменне маніпуляваць грамадскай думкай з дапамогай плятканства і нагавораў, і, таксама, здольнасці да распаўсюду ілжывай, або палохаючага зместу інфармацыі. Як бы там не было, а бальшыня беларусаў верыць у тое, што іх ніхто не кране, калі яны самі не закрануць палітычнай сферы. Можа таму так баяцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь засвяціцца у якой-небудзь грамадскай арганізацыі або палітычнай партыі, а тым больш на масавай пратэстацыйнай акцыі, і бяздумна вераць у тое, што пры выкананні няпісаных правілаў маўчання і бяздзеяння іх праміне гэта чаша палітычнага перасследу.

Можна было б прыводзіць безліч прыкладаў з гісторыі чужой і нашай, што гэтая думка не мае анічога агульнага з рэчаіснасцю. Напрыклад, большасць крыкаў людзей, знішчаных сталінскай або гітлераўскай рэпрэсіўнай машынай гучалі балючым і шчырым пытаннем: „За што? У чым я вінаваты? Што я такога зрабіў?" Ды, на жаль, нагадваць пра тое не мае аніякага сэнсу, бо гісторыя, з большага, ні чаму не навучыла шырокія масы і ні ў чым іх не пераканала, бо тыя масы складаюцца з адзінкавых прадстаўнікоў, якія разважаюць як тая закаханая ў разбэшчанага лавеласа дзяўчына: „Гэта другіх ён падманваў і мне да таго няма справы. А мяне ён кахае, абавязкова ажэніцца і стане верным, сумленным і любячым мужам". І той дзяўчыне не ўцяміць, што да яе менавіта так разважалі ўсе папярэднія дурніцы. Таму лепш вярнуцца да сённяшняга дня і тут пашукаць фактаў ды каментарыяў.

Сустрэў я неяк аднаго знаёмага таксіста. Хлопец ад палітыкі далёкі і заангажаваны толькі тым, каб сумленнай і руплівай працай зарабіць як мага больш грошай для сваёй, гэтакай жа апалітычнай сям'і. Моўчкі вытрымліваў ён падвышэнне падаткаў і ўсё новыя патрабаванні да касавых апаратаў і стану машыны, і стабільна растучыя кошты ў крамах і ўсе іншыя нязручнасці ды навалы. Лічыў, што калі ён сумленны, чэсны ды рахманы, то пражыве са сваёй працы, спакойна і бясслаўна памрэ, пакінуўшы ў спадчыну сваім дзецям такое ж шэрае і нуднае, але без палітычных клопатаў жыццё.

Ды не туды тое. Неяк у змаганні за кліентаў пасадзіў ён у сваё таксі незнаёмых людзей з рэчамі, завёз куды тыя сказалі, узяў свой ганарар і шчаслівы паехаў дахаты. Спакойна паспаў ноч, а назаўтра зноў пасунуўся шукаць чарговых кліентаў. І кліенты знайшліся. Толькі не такія, як ён хацеў. Яны замест каб куды ехаць, пачалі пытацца, каго вазіў учора, куды і з чым.

І як не тлумачыў напалоханы хлопец, што ён проста таксіст, возіць усіх хто плаціць, і туды, куды скажуць, і ніякага большага дачынення да ўчарашніх кліентаў не мае, яму не паверылі. А можа і паверылі, але ўсё адно няшчасны таксіст чакае непрыемнасцей, бо яго ранейшыя кліенты, ён так зараз мяркуе, былі апазіцыянерамі ці яшчэ кім з „ненадзейных" колаў. А везлі яны з сабой ці то афіцыйныя газеты ці то неафіцыйныя ўлёткі. І таму зараз, нават яму, чалавеку выпадковаму, не даруюць такога „супрацоўніцтва" ў выглядзе транспартных паслуг. Але самае цікавае тое, што шафёр таксі лічыць, што ён сапраўды вінаваты, бо мусіў (невядома толькі адкуль) ведаць хто ўлада, а хто апазіцыя і не звязвацца з апошнімі.

Вось і не мінулі і яго палітычныя клопаты. Як аказалася, у грамадстве дзе небяспечна займацца палітыкай, кожны павінен быць палітычна адукаваны больш, чым самі палітыкі. І тая фраза, што калі ты не займаешся палітыкай, то палітыка зоймецца табой, тут найбольш актуальная.

Віктар САЗОНАЎ

Нашы міграцыі

Наша малая айчына, Беласточчына, прыгожая і дарагая нам. Але нялёгка жылося ў ёй нашым продкам. Нямала дасталося яшчэ і на долю майго пакалення. Колькі толькі войнаў адбылося на яе тэрыторыі? Колькі рознай салдафоншчыны пабывала тут? Колькі адбылося міграцый-эміграцый адсюль?

Найбольшая і найтрагічнейшая з іх гэта, канешне, бежанства 1915-1922 гадоў, бо многа народу загінула тады, многа было пакалечана, многа не вярнулася назад. І ў сэнсе гаспадарчым яно адкінула нас на год пяцьдзесят назад...

У час нямецкай акупацыі зноў перасяленні. Многія нашыя вёскі былі ліквідаваны, спалены, а іх жыхары супраць іх волі пераведзены ў іншыя месцы. Многія жыхары вёсак былі пераселены ў гарады. Найгоршым была аднак тады высылка нашых людзей на прымусовыя работы ў Германію. Высылалі маладых хлопцаў, дзяўчат і цэлыя сем'і. Зазналі яны там бяды нямала і зноў жа многія не вярнуліся адтуль дадому, бо або загінулі, або былі вывезены з Германіі ў Савецкі Саюз і адтуль не пусцілі іх дадому...

Пасля вайны наступіла рэпатрыяцыя нашага народа ў СССР. Яна нібыта і не была прымусовай, але многія нашы людзі былі проста вымушаны ўцякаць з дому ад банд. Іншыя былі проста абманутыя савецкімі вярбоўшчыкамі, абяцаўшымі багатыя выгады ў СССР. На самой жа справе вывозілі іх у халодную, галодную і непадрыхтаваную прыняць іх краіну...

Хутка потым распачаліся ўжо добраахвотныя перасяленні на Заходнія Землі Польшчы і масавыя вандроўкі з вёсак у гарады і прамысловыя цэнтры. Пачалі адна за другой наступаць змены ў нашым жыцці. Змяняліся гарады і сёлы, змяняліся палеткі, змянялася таксама грамадства наша і яго менталітэт, на жаль, не заўсёды на лепшае.

Найбольшыя, здаецца, змены наступалі ў нашай Малой айчыне. Можа таму, што яна была найбольш занядбанай, пакрыўджанай, беднай. Першымі станоўчымі крокамі змен было тое, што ў часы Народнай Польшчы пачалі памаленьку, так бы мовіць, разгружацца нашы моцна перанаселеныя вёскі. Нашы тутэйшыя людзі атрымалі нарэшце магчымасці ісці на працу ў гарады, прамысловыя цэнтры і, што найважнейшае, у навуку. Гэтыя шанцы былі выкарыстаны нашым народам. І хоць наша сельская гаспадарка, асноўны тады занятак нашага тутэйшага народу, надалей чахла, людзі, адышоўшыя з яе або дапамагаючыя гаспадарцы яшчэ іншымі заняткамі, мелі някепска.

Потым дайшла калектывізацыя — і яна ўжо зусім дабіла вёску. У сялян прапала ахвота быць земляробам, селянінам. Пачалі масава ўцякаць з вёскі або шукаць іншага занятку. У якія толькі куткі Польшчы не трапілі тады нашы беларусы. Многія з іх або іх наступныя пакаленні перасталі, на жаль, адчуваць сябе беларусамі, праваслаўнымі. Так мы страцілі тады многа нашага нацыянальнага патэнцыялу. Траціли мы яго, зрэшты, амаль ва ўсёй сваёй гісторыі на карысць іншых народаў...

А цяпер то і ўвогуле здаецца, што ўвесь род чалавечы перасеў на калёсы і прэ як ашалелы ва ўсе канцы свету. Масава пруцца туды і нашы тутэйшыя беларусы. І дзесьці там, далёка ад дому, не ўсе яны астануцца беларусамі і праваслаўнымі, а папоўняць нейкую іншую рэлігію і нацыю. Або астануцца безнацыянальнымі, безрэлігійнымі грамадзянамі свету. Існуе цяпер такая тэндэнцыя.

Страціць жа сваю, атрыманую ад сваіх продкаў, нацыянальна-рэлігійную спецыфіку, нацыянальна-рэлігійны калярыт гэта вялікая страта. І грэшная. Страціць сваю Радзіму, вялікая ці малая яна, таксама вялікая страта. Калі ўжо, па той ці іншай прычыне, страцілася яе, то хаця трэба мець яе заўсёды ў сэрцы, любіць і шанаваць яе...

Нам трэба браць прыклад з прыроды, вучыцца ад яе. Прырода разумная, памяркоўная, прадбачлівая. Яна не робіць глупстваў, як часта мы, людзі. Нават такая птушачка, рабачок і мушка маюць свой розум, любяць і шануюць сваё роднае.

Вось, напрыклад, кімсьці падслуханы дыялог паміж бацькам-рабаком і яго сынком-рабачком:

— Папа, — звяртаецца сынок-рабачок да таты-рабака, — а можем мы жить в яблоке?

— Можем, сынок.

— А можем в апельсине?

— Конечно, можем.

— Так почему жиём в дерьме?..

— Дорогой мой мальчик, есть ещё такое понятие как Родина...

Вось бачыце колькі тут дабрыні, логікі, ды і патрыятызму, калі хочаце...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

(Не)патольныя элементы

У чарговы раз крыўлюся на ўспамін якраз закончаных Дзён Беластока. Паколькі здавалася мне, што пасля таго, як Тадэвуш Трускаляскі стаў уладаром сталіцы Падляшскага ваяводства з Грамадзянскай платформай на фоне (ну, можа на першым плане), узрасце тут своеасаблівая ўражлівасць на культурныя патрэбы беларускай меншасці. З надзеяй, значыць, у запрашэнні і на плакатах учытваўся я ў прапановы сёлетніх Дзён Беластока. Былі фільмы паводле прозы Эдварда Рэдлінскага, канцэрт вядомага джазмена Яна Пташына Врублеўскага, спаборніцтвы аэрастатаў ці выступленне познаньскага балета. Прытым цікава, што некаторыя з мерапрыемстваў, незалежна ад таго, ці былі б арганізаваныя Днямі горада, і так бы адбыліся. Маю тут на думцы вернісажы ў галерэі „Арсенал", традыцыйны ўжо „Кірмаш на Яна". Здаецца, былі яны „падцягнутыя" пад гэтае ў блізка два тыдні святкаванне. З прапаноў накіраваных галоўным чынам да асяроддзя беларускай меншасці ў афіцыйных аб'явах я не знайшоў нічога, не ўспамінаючы пра канцэрт царкоўнай музыкі, які адбыўся ў рамках Дзён Беластока яшчэ пры прэзідэнцтве Рышарда Тура і — як мне здавалася — быў своеасаблівым апраўданнем тае часта ўспамінанай разнамаснымі чыноўнікамі беластоцкай шматкультурнасці. Ад знаёмых даведаўся я, што перад беластоцкім асяродкам культуры (аднаго з арганізатараў Дзён) у адзін з гэтых дзён адбыўся канцэрт двух рок-гуртоў з Беларусі, сярод іх легендарнага „Рэха". Тае прапановы не было аднак ні ў запрашэнні перасланым прэсе прэзідэнтам горада Беластока і БАК. Ці можа хтосьці гэтага беларускага матыву буйных беластоцкіх святкаванняў пасаромеўся?

Думаю так сабе пры гэтай нагодзе, што ГП і спадар прэзідэнт Трускаляскі беларусаў у практыцы г.зв. штодзённага жыцця рэгіёна прыкмячаюць адно ў кантэксце выбарчых кампаній. Важнейшым ад заспакаення культурных патрэб і ўпісання іх у культурнае агульнагарадское жыццё пану прэзідэнту і яго заплеччу з'яўляецца хоць бы быць ці не быць латку з марозівам на Плянтах. Некалькі тыдняў таму прэс-інфарматар прэзідэнта прыслала такую вось інфармацыю: „Спадар Прэзідэнт ніколі не быў прыхільнікам ліквідацыі латка з марозівам на Плянтах, паколькі паважае каштоўнасці і традыцыі важныя для беластачан ды разумее, што ў мяняючымся свеце колькасць пастаянных элементаў дае патолю".

Прыкра, што спадар прэзідэнт і некаторыя чыноўнікі не разумеюць, што гэтыя каштоўнасці і традыцыю складае таксама шырока разуметая беларушчына. Шкада, што глядзеўшы на апошнія Дні Беластока, беларушчына не з'яўляецца для пана прэзідэнта „пастаянным элементам". Мабыць, я памыляюся, але прэзідэнт больш пераняўся стратай, якая вынікае з магчымага знікнення латка з марозівам, чым магчымым страчаннем вынікаючым з таго, што беларуская культура ў горадзе сапхнутая на абочыну, а нават ігнаруецца. Дарэчы, а прынамсі мне так здаецца, праблемы з беларушчынай ёсць таксама ў цяперашняга самаўрада ваяводства. Яшчэ да вылучэння новых улад Падляшша камісар Яраслаў Схабенскі стварыў капітул, які мае назначаць званне пачэснага грамадзяніна ваяводства. Апынуліся ў ім: адзін каталіцкі ксёндз, не скрываючы сваіх праваканаліцкіх перакананняў літаратурны крытык, звязаны з ПіС высокамазавецкі староста, сам маршалак (ад ПіС) і адзін з прадпрымальнікаў, таксама не скрываючы сваіх ПіСаўскіх перакананняў. І тут, у гэтым капітуле, няма месца для прадстаўнікоў беларускай меншасці, хоць маршалак Дарыюш Пянткоўскі прадбачыў верыфікацыю складу капітула. Ці і для кіруючага ваяводствам ПіС беларушчына з'яўляецца элементам, які не прыносіць патолі?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Толькі ты, Коля, маеш найбольшы шанц...

Ару сам і сею сам

„Ніва" *(пасля гадзіны ад дамоўленага часу сустрэчы)*: — ***Вы часта даводзіце да таго, што Вас трэба чакаць?***

Мікола Яноўскі (беларус па паходжанні, член Падляшскай управы ад ПСЛ, кааліцыянта галоўнай кіруючай ваяводствам партыі ПіС, адказны галоўным чынам за сельскую гаспадарку): — Сардэчна прашу ў вас прабачэнння. Ды гэта толькі трэці тыдзень як я тут займаюся. Толькі што азнаямляюся з працай. Вы мусілі мяне пачакаць, бо якраз я меў сустрэчу на тэму заснавання дапаможнай адзінкі па справах аб'ядноўвання грунтаў. Былі тут у мяне геадэзісты. Хочам стварыць гэтую ўстанову, каб не ўцякалі нам грошы. У 2006 годзе наша ваяводства страціла з-за таго, што яе ў нас не было, 3 мільёны злотых. Ужо ў першыя дні ад назначэння мяне на пасаду члена Падляшскай управы я рашыў, што такую ўстанову створым. Ёсць шанц, што ўдасца нам на аб'ядноўванне грунтаў выкарыстаць яшчэ 3,6 млн зл. За гэтыя грошы можна будзе зрабіць парадак на палях, пабудаваць дарогі, шлюзы. Ахопіць гэта 20-30 тысяч гектараў. Я хацеў бы ў найбольш магчымай ступені выкарыстаць еўрасаюзныя сродкі на сельскую гаспадарку.

— ***А колькі грошай можна прыдбаць?***

— Усё яшчэ вядуцца перагаворы. У Падляшша найменшы каэфіцыент у маштабе краіны. На маю думку, ён павінен быць значна большы і нам павінна дастацца неякіх 30 мільёнаў еўра. Аднак развіццё ваяводства гэта пытанне не адно грошай. Маёй марай з'яўляецца, напрыклад, перанясенне таварнага руху аўтафураў з дарог на пуці. Аднак, чыгунка нерэфармавальная. А трэба было б стварыць перавалачныя станцыі, якія падганялі б развіццё ваяводства. Калі б мець тут хоць бы сядзібу фірмы „Орлен" — ужо і лепш не трэба было б. Шмат інвестараў не ведаюць, якія ў нас магчымасці. Напрыклад, хто ведае аб гэтым, што ў нас маюцца шырокія пуці непадалёк перахода ля станцыі Хрызанаў. Трэба было б адабараць іх чыгунцы і выкарыстаць для гандлю з Усходам.

— ***Ад чаго залежыць тое, каб назначаны былі нам вялікія грошы?***

— Ну, ад мае працы, ад таго, ці пераканаю ўлады ў Варшаве.

— ***Значыць, трэба пераканаць Самаабарону, лідэр якой кіруе Міністэрствам сельскай гаспадаркі?***

— Не кажу, што толькі Самаабарону. Таксама трэба пераканаць і Міністэрства фінансаў [ПіС — М. Х.]. Справа ў тым, каб пытанне аб'яднання грунтаў пры размеркаванні грошай у Варшаве было прынята пад увагу. Электарат Самаабароны тыпова вясковы. Самаабарона дбае, а прынамсі павінна дбаць аб гэты электарат.

— ***Ці няма канфліктаў паміж Вамі, дзеячам ПСЛ, і разнамаснымі прадстаўнікамі Самаабароны?***

— З боку Самаабароны крануў мяне толькі факт, што якраз яна адхіліла мяне ад пасады кіраўніка павятовага бюро Агенцтва мадэрнізацыі і рэструктурызацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы.

— ***Вось так. Не крыўдуеце з-за гэтага на Самаабарону?***

— Абсалютна не. Чалавек, які пагаджаецца на тое, што будзе выконваць публічныя функцыі, мусіць прымаць пад увагу тое, што сёння ён ёсць, а заўтра яго няма. Калі такі чалавек абражаецца, то хай займаецца сваёю гаспадаркай ці прыватным бізнесам. Такі ў мяне характар, што жыву сённяшнім днём і не выходжу ў будучыню. Не люблю памятаць таго, што было.

— ***Як мае выглядаць кампраміс паміж членамі ўправы ад ПСЛ, значыць, Вамі і віцэ-маршалкам Янам Камінскім ды апошнімі трыма прадстаўнікамі ўправы ад ПіС?***

— Усё мае адбывацца шляхам размовы падмацаванай аргументамі, канкрэтнай размовы пра гаспадарку. Палітычныя рашэнні не заўджы суправаджаюцца гаспадарчымі рашэннямі. Мая роля — гэта пераконванне да гаспадарчых аргументаў, стратэгічных, а не палітычных. Баюся, што маё мышленне іншае чым у маіх калег, бо мне здаецца, што апошнія члены ўправы хутчэй думаюць палітычна. Ды маю надзею, што мне ўдасца іх пераканаць да сваіх гаспадарчых аргументаў.

— ***Вашы партыйныя начальнікі, напрыклад, член краёвых улад ПСЛ Марэк Савіцкі, увес час не пакідаюць сухой ніткі на ПіС. Вы таксама да выбараў не адмаўляліся, далікатна кажучы, ад крытыкі кіруючай краінай партыі. ПСЛ у маштабе краіны ў апазіцыі да ПіС, а на Падляшшы ў Вас з гэтай партыяй квітнее любоў, сяброўства ды братэрства. Як гэта так?***

— Не скрываю, што ў падляшскім самаўрадзе я быў за кааліцыяй ГП, СЛД і ПСЛ, а найлепш было б, каб усе палітычныя групоўкі, усе трыццаць радных мелі свайго прадстаўніка ва ўправе і прэзідыуме Сеймікa. Не ўдалося б гэтага зрабіць па чыста палітычных прычынах. Рашэнне аб размовах з ПіС прыняў ваяводскі прэзідыум ПСЛ. У час гэтых вырашэнняў я быў у меншасці. Нельга ж было дазволіць, каб чатыры наступныя гады ваяводствам кіраваў камісар. Нашы спрэчкі ў Сеймікі папярэдняга склікання паўплывалі на тое, што ўсё ваяводства шмат страціла. Хоць веру, што новая ўправа будзе змагацца за развіццё Падляшша, то не скрываю, што будзе нам разам вельмі цяжка.

— ***А што такое ПіС абяцала ПСЛ, што яно ўвайшло ў кааліцыю?***

— 27 мая сесія, на якой выбіралі ўправу, пачыналася ў 10 гадзін. У той дзень я яшчэ ў 9 быў супраць уваходу ва ўправу. Аднак усе самаўрадаўцы ў глыбінцы, з якімі я размаўляў, казалі мне: „Едзь і дай згоду, ёсць нейкі шанц". Я разумеў, што гэтая пасада прыемная: шафёр, сакратарка... Толькі што мне на гэтым не залежыць. Калі я даў згоду, дык таму, каб выканаць працу ў гаспадарчай сферы. Калі мне не ўдасца, то незалежна ад таго, ці ПСЛ застанецца ў кааліцыі, адыду. Я не прывязаны да крэсла. Апрача таго думаю, што ПіС зразумела, што не мае сэнсу далейшая шарпаніна, палітычныя гульні і таксама хоча паказацца ў якасці добрага гаспадара. ПіС нічога ПСЛ не абяцала. Размовы датычылі толькі таго, што ад нашай партыі будуць старшыня Сеймікa, віцэ-маршалак управы і член управы, а апошнія будуць ад ПіС.

— ***Ну так, з клуба ПСЛ з пяці дэпутатаў двух вашых радных пакрыўдзілі. Не дасталіся ім ніякія пасады.***

— Ды ў клубе ПіС на дванаццаць радных аж дзевяць „пакрыўджаных", а ў ПСЛ толькі двух. Дарэчы, а што ж гэта значыць пакрыўджаных?

— ***Без пасад.***

— Я прымаў удзел у выбарах на раднага не для нейкай там пасады. Паўтараю, што я да апошняй хвіліны не хацеў пагадзіцца на выбар мяне ва ўправу. Былі іншыя, якія ахвотна занялі б гэтую пасаду, ці то Башко з Саколкі, ці то Бажухоўскі з Замбрава [абодва яны радныя клуба ПСЛ без пасад — М. Х.]. Самаўрадаўцы з глыбінкі аднак казалі мне: „Ідзі, Коля. Калі нават зашмат не зможаш, то прынамсі будзем мець у нас інфармацыю".

— ***Вы, аднак, пасля роспуску папярэдняга Сеймікa агаворваліся, што ўжо не будзеце балатавацца.***

— Я сказаў у час адной з вострых дыскусій перад самым роспускам Сеймікa папярэдняга склікання, што мы ўсе павінны мець забарону балатавацца. І далей так мяркую. Тое, што я зноўку выйшаў на выбары, гэта не было маё рашэнне. Так вырашылі самаўрадаўцы Гайнаўскага павета ніжэйшага рангу: гмінныя і павятовыя радныя, войты, але і сяляне, Сельскагаспадарчая палата. Сказалі: „Толькі ты, Коля, тут побач Сычэўскага, маеш найбольшы шанц стаць радным". І так атрымалася, што ў Гайнаўскім павеце на вясковай тэрыторыі я атрымаў 50-60% галасоў. За гэтую перамогу адпакутуе мая сям'я, бо я, мабыць, лішне з галавою акунаюся ў вір спраў. Цяпер, калі я выязджаю з хаты, дзеці яшчэ спяць, вяртаюся — ужо спяць.

— ***Прыгадайце, калі ласка, колькі ў Вас гектараў зямлі?***

— Пяцьдзесят.

— ***А хто цяпер займаецца Вашай гаспадаркай?***

— Мой тата выводзіць кароў, жонка ўпраўляецца з кабылай і займаецца драбнейшымі справамі. Я ару і сею сам. Зараз жа пасля назначэння мяне не члена ўправы трэба было апырскаць збожжа. У адно, другое світанне я ўстаў а палове чацвёртай і апырскаў. Сёння, калі мы размаўляем, меў я апырскаць бульбоўнік ад каларадскага жука, ды пакуль што ідзе дождж. Вярнуся з установы — можа, удасца. Дарэчы, можа гэта і лепш, бо з-за пчол нельга апырскваць раніцай, а і вуллі ў мяне ёсць таксама.

— ***Дык калі Вы высыпаецеся?***

— Сплю колькі ўдасца... Дарэчы, я член управы, які найраней прыходзіць на працу. Заўсёды да паловы восьмай.

— ***Вы сёння спазніліся на ўсе 5 хвілін. Вы дамовіліся са мною на 7.20, а ў кабінеце былі ў 7.35.***

— Ды што вы! Немагчыма. Я быў у 7.30, хоць фактычна заўжды прыязджаю ў 7.20.

— ***Ну, хай будзе... Вам падначалены ў Маршалкоўскай управе нехта Павел Апалінскі, які займаецца меліярацыяй, былы капітан Службы бяспекі, славуты тым, што праследаваў апазіцыю ў час ваеннага становішча. Што намерваецеся зрабіць з такім „падкідным"?***

— Я даведаўся аб гэтым дзень да нашай размовы. Я не ведаю пана Апалінскага. Толькі што ў размове з маршалкам я даведаўся, што пан Апалінскі ад восені ва ўстанове не працуе. У падлеглых мне Рэгіянальным асяродку сацыяльнай дапамогі ды Дэпартаменце сельскай гаспадаркі і меліярацыі працуе каля 360 чалавек. На працягу трох тыдняў я не быў у змозе пазнаёміцца з усімі. Я сабраў нараду работнікаў і сказаў, што іх партыйная прыналежнасць і тое, што было ўчора, мяне не турбуе; цікавіць мяне адно іх працавітасць і кампетэнтнасць. Важна, каб наша ўстанова служыла жыхарам ваяводства, а не наадварот. Я сам ужо пачаў наносіць візіты ў глыбінку, што ашарашыла маіх некаторых працаўнікоў, якія мне сказалі, што гэта людзі з глыбінкі павінны прыязджаць да мяне. Кіраўніку па тэхнічных справах я загадаў памяняць карціну ў маім кабінеце. Бачыце, тут такі краявід з лужком ды рэчачкай. А я хачу, каб павесілі тут такі, на якім відаць працу, пот селяніна ў полі. Каб мне не забыцца, адкуль я.

Мікола Яноўскі беларус па паходжанні, член Падляшскай управы ад ПСЛ

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Падслухаў...

Падслухаў я аднойчы гутарку двух паляўнічых, Яські і Ёзіка.

Яська пытаецца ў Ёзіка: чаму, калі да цябе не прыйду, у вас заўсёды ёсць свежая дзічына?

— Бачыш, Яська, кожны паляўнічы павінен гадаваць сваіх свіней, — адказаў Ёзік.

— А чаму гэта так?

— Бачыш, калі ў мяне гукае свінаматка, дык я заганяю яе ў клетку і вязу на фурманцы ў лес. Там, непадалёку сцежкі праходу дзікоў, здымаю яе з фуры ды маскірую так, каб не было нічога падазронага, а сам ад'язджаю фурай у бяспечнае месца. Потым вяртаюся і з задняй часткі клеткі рассыпаю наркоз. Дзік-самец пачуе пах свінні за некалькі кіламетраў і прыбяжыць туды, а калі не зможа дабрацца да свінні, то ён нюхае зямлю. Так надыхаецца наркозу, што адыдзе некалькі дзесяткаў метраў і... засынае. Тады я падыходжу да яго, зарэжу, выпатрашу і ў фурманку. Часам за ноч „злаўлю" трох дзікоў.

— Ну, і што ты, Ёзік, робіш з таго мяса?

— Частку застаўляю сабе і сваёй сям'і, а астатняе мяса прадаю ў рэстаран-гасцініцу.

— Ну і што далей?

— Ці, ты, Яську, не разумееш, што і мая сям'я задаволеная, і я маю грошы ды і на закусцы з дзічыны добра заробіць рэстаран, а людзі з наваколля таксама задаволены, што ўжо дзікі не будуць ім нішчыць бульбянішчаў.

— Пайду дадому, раскажу жонцы, і мы ў чацвер паедзем на рынак у Бельск купіць парасят.

Так паляўнічыя развіталіся. Цяпер Яська ўжо гадуе парасяткі на свінаматак.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Нашы солтысы

Чытачам „Нівы" хачу прадставіць солтыса вёскі Зубава, што на Бельшчыне, **Грышу Кананюка**. Выконвае ён гэтую грамадскую функцыю ўжо трэці тэрмін. З жонкай Лідзіяй яны пенсіянеры, на структурнай сялянскай пенсіі. Гаспадаркай цяпер займаецца сын Міраслаў, які жыве ў Зубаве, дапамагае замужняя дачка Івона з сям'ёй, якая пражывае ў Бельску. Спадар Грыша цікавіцца рыбалкай, у яго сёць сажалка. Жонка Лідзія вельмі любіць кветкі, многа іх расце на панадворку. Навокал чысціня, парадак.

У вёсцы дзейнічае крама і пункт скупкі малака. Зубава налічвае пад 90 хатаў. Нельга не заўважыць, што маладых гаспадароў мала. Сваім дасягненнем спадар Грыша лічыць рамонт злеўні малака, памаляванне прыпынку ПКС, рамонт дарогі па-за сялом і на хутары, дзе сяляне даязджаюць да палёў і сенажацей, а таксама ачышчэнне з хмызняку паваротаў дарог у вёсцы. Спадарства Кананюкі — добразычлівыя людзі і нікому не адмаўляюць у патрэбе. Яны выдатна служаць вясковай грамадскасці і карыстаюцца пашанай аднавяскоўцаў. Застаецца пажадаць ім моцнага здароўя ды далейшых поспехаў.

Жэня МАРТЫНЮК

Нешта свойскае...

XII Міжнародныя сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка", якія праходзілі сёлета ў Чаромсе ад 3 па 10 чэрвеня, можна лічыць удалым мерапрыемствам. Арганізатары так падрыхтавалі праграму, што кожны з удзельнікаў імпрэзы знайшоў сабе нешта для „цела і духа". Ад 3 па 8 чэрвеня адбываліся тут тэатральны, тэатральна-музычны і тэатральна-танцавальны майстар-класы для дарослых, а ад 4 па 7 чэрвеня — для дзетак ды школьнай моладзі. Заняткі з дарослымі вялі акцёр Станіслаў Яскулка (вядучы фестывалю) разам з гуртом „Горына" з Украіны, а для дзетак — акцёры лялечнага тэатра „Акно" з Беластока. У майстар-класах займалася каля сарака (сталых) удзельнікаў. Варта адзначыць, што ў час заняткаў з дарослымі быў пастаўлены спектакль на аснове кніжкі „Журавейка" Веслава Разбіцкага, чарамшаніна.

— Мэтай імправізацыі, якая зводзілася да чытання тэксту пры століках, — гаварыў Станіслаў Яскулка, — было выкліканне ў гледача фантазіі, якая тычылася герояў ды месца падзеі. І гэта ўдалося. Пачаткова я не лічыў на станоўчы вынік гэтай ідэі. Не было ахвотных выступіць перад публікай. У сераду такую гатоўнасць заявілі адно чатыры асобы, але неўзабаве паступілі чарговыя заявы. Канчаткова згуртавалі мы неабходны састаў з дванаццаці чалавек. У ролю асноўнага героя, Ярэка, увасобіўся Мірэк Самасюк. Рэпетыцыі працягваліся тры дні. На чацвёрты, у суботу, выступілі мы перад публікай. Зала была запоўненая. Хоць на сцэне не было мастацкага афармлення, адно гульня святла і чытаныя тэксты, публіцы не цяжка было здагадацца, што падзеі тычацца... іхняй Чаромхі. Аб гэтым сведчылі водгукі залы...

Станіслаў Яскулка з чаромхаўскім фестывалем звязаны амаль ад пачатку. Спадабаў ён тутэйшую публіку, своеасаблівую атмасферу, гасціннасць людзей ды смакавітыя стравы, якія рыхтуюць вясковыя гаспадыні. Купіў ён дом у Зубачах і стаў членам чаромхаўскага асяроддзя. У час шматлікіх мерапрыемстваў, на якія запрашаюць яго арганізатары з усяе Польшчы, заахвочвае ён знаёмых пайсці яго следам. Сёлетнія сустрэчы „З вясковага панадворка" зводзіліся ў асноўным да арганізавання майстар-класаў. Апрача заняткаў у тэатральнай групе, праводзілася навука танцаў ды гульня з агнямі. Дэманстраваліся этнаграфічныя фільмы. Была выстаўка тэатральнага плаката ды рукадзелля, прадаваліся вырабы падляшскіх майстроў. Можна было купіць касеты і дыскі выступаючых на фестывалі гуртоў. А гэтых было хоць адбаўляй. Апрача айчынных, на чаромхаўскай сцэне выступілі калектывы з Латвіі, Украіны, Францыі, Расіі, Славакіі. Беларусь прадстаўлялі „Валацюгі" з Хмелева, фальклорны гурт з вёскі Дзяменічы, „Тастамент" ды народны хор „Вербніца" з Пружан. У кожнага калектыва своеасаблівы жанр і багаты рэпертуар. Усе яны карысталіся поспехам у гледачоў.

Асаблівасцю завяршальнага дня фестывалю (нядзеля, 10 чэрвеня) быў конкурс страў рэгіянальнай кухні — ідэя Ніны Ефімюк, спецыяліста Падляшскага асяродка сельскагаспадарчай кансультацыі. Гэта яна з дванаццаццю ўдзельніцамі падрыхтавала стравы. Публіка магла пакаштаваць дваццаць смакоццяў, якія ацэньваў старшыня журы Мацей Курань. Была кішка з грачаных круп і тварожнік вырабу Крыстыны Кас'янюк, вараны боб і фасоля, а таксама хлебны квас Веры Серадынскай, бульба ў лупінах з пражаным ільном Любы Салінскай, булачкі з тваражком і дражджавая здобная булка Валянціны Ефімюк, аўсяны кісель з трускалкавым мусам Анны Бядулі, пірог з грыбочкамі ды капустай Іаанны Пушкарэвіч. Шупеню (куццю з фасоляй), якую рыхтуюць дабрыводскія жанчыны, прэзентавала Крыстына Мазалеўская, вясковы тварог, масла ды паштэтную кішку — Ніна Дэмідзюк, аладкі і кампот з сушаных фруктаў — Данута Пецыхна, бульбу ў вафелі — Люба Раманюк, тлушч са скваркамі — Клаўдзія Маеўская, а бульбяную бабку ды соленае сала падрыхтавала Вера Маркевіч. Як падагуліў Мацей Курань, журы мела праблему з вылучэннем пераможцаў конкурсу. Канчаткова першае месца заваявала Крыстына Кас'янюк за кішку з грачаных круп і тварожнік, другое — Вера Маркевіч за бульбяную бабку, а трэцяе — Ніна Дэмідзюк за вясковы тварог, масла ды паштэтную кішку. Апрача таго журы прызначыла два дыпломы: Іаанне Пушкарэвіч за пірог з грыбочкамі ды капустай і Любе Салінскай за бульбу ў мундзірках з пражаным ільном. Узнагароды прыдбала Гмінная ўправа. Апрача пераможцаў падарункі атрымалі ўсе ўдзельніцы конкурсу, а для пяці вылучаных асоб Мацей Курань уручыў сваю кухарскую кніжку з дароўным надпісам.

Арганізатарамі фестывалю XII Міжнародныя сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка" былі Гмінны цэнтр культуры і Таварыства любіцеляў народнай культуры ў Чаромсе ды гурт „Чарамшына", маторам якой з'яўляюцца Барбара Кузуб-Самасюк і яе муж Міраслаў. Надвор'е сёлета паспрыяла мерапрыемству. Публіка таксама не падвяла. Засталося адно падзякаваць арганізатарам, а таксама спонсарам за фінансавую падтрымку, і пажадаць плённай працы на ніве роднай культуры.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Усе на сенажаць

Хто толькі здаровы і здольны касой махаць, усе на лугі, на сенажаць! Так было даўней, калі нам бядней жылося. Тады ўсе косамі касілі, граблямі заграбалі. А адвячоркам, хаця стомленыя былі, вяртаючыся дахаты песенькі спявалі. Аднак на другі дзень з самага ранку працу пачыналі нанава.

Выйдзеш бывала зранку на панадворак і чуеш: стук, стук, стук. Гэта мужыкі косы клеплюць. Аднамерны стук малаткоў разносіцца па ўсёй вёсцы. Так іх дапраўляюць, каб танчэйшымі і вастрэйшымі былі. Каса найлепш траву косіць, калі на ёй раса. Нездарма пагаворка між людзей існуе: „Касі каса, пакуль раса. Раса далой, каса дамой".

Вельмі ўстойлівыя касцы цэлы дзень косяць. Сонейка пячэ, жар з неба ліецца, а яны ўпарта косяць, спякоце не паддаюцца. Пот з твару цячэ, вочы залівае, а касец рукавом яго змахне і далей касой махае. Мужык, аднак, не здаецца, дапераду ўсё пнецца і пнецца. Трэба, каб скошаная трава на адзін бок не адзін дзень паляжала. А потым уся сям'я на другі бок яе ўмела варочала. А калі ўжо здаецца, што сена ўжо сухое, тады бацька бярэ яго, у руках пацірае і ўрачыста ўсім аб'яўляе: „Ну, сена, здаецца, сухое. Пара ў стадолу яго вазіць. Напэўна зіму пералежыць. Не сапсуецца яно. Будзе чым звярыну пракарміць і спакойна да вясны дажыць. Сена выпала сухое, духмянае, малако будзе здаровае".

Найгорш, калі дажджы прыйдуць. Тады даўжэй трэба сена сушыць, больш працы ўлажыць. Не адзін раз у капіцы складаць трэба. Напрыклад, у нас, капіцы павінны былі быць прыгожыя, акуратныя і так зложаныя, каб не прамоклі. А найгорш складаць як хмару вецер наганяе ды буру з грымотамі. Тады адна толькі бяда. Капіцу складаеш, а вецер сена забірае, па ўсёй сенажаці раскідае. А мужык толькі войкае і нанава збірае. Ой, чаго тады мы не перажылі, аж страх падумаць. Праўду кажуць: „Калі кепскага не пакаштуеш, тады не ведаеш як дабро смакуе".

Грыша МАРОЗ

Адметнасць і сіла „Басовішча”

Размова з Радаславам ДАМБРОЎСКІМ — старшынёю Беларускага аб’яднання студэнтаў ды арганізатарам сёлетняга фестывалю „Басовішча”.

Ілона Карпюк: — ***Дзеля чаго існуе Фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча”?***

Радаслаў Дамброўскі: — „Басовішча” ўвесь час патрэбнае дзеля падтрымкі беларускай культуры. Гэта свята беларускай музыкі, але перад усім свята маладых беларусаў, важнае як дзень нараджэння.

— ***Чаму людзі прыязджаюць на гэты Фестываль?***

— Ёсць пару прычын. Напэўна таму, каб адчуць гэтую своеасаблівую атмасферу найбольшага, па-мойму, беларускага фестывалю „open air”. З другога боку прыцягвае атмасфера, на якую ўплывае месца, але ў галоўным людзі. Прыязджаюць яны сюды, каб сустрэць аднадумцаў.

— ***Ці Фестывалю пад сілу канкураваць з іншымі фестывалямі ў нашым рэгіёне, Польшчы, свеце? Ты сказаў раней адно слова-ключ „open air”...***

— Думаю, што можам канкураваць з многімі фестывалямі і па музычным узроўні, і па колькасці гледачоў, нават з „Heineken Open’er” *(смех)*.

— ***Тады ў чым адметнасць і сіла „Басовішча”?***

— Перад усім гэта ж міжнародны фестываль. Але гледачы мэтанакіраваныя, прыязджаюць дзеля прыемнасці, але і з канкрэтнай думкай у галаве. Ведаюць, што „Басовішча” — беларускі фэст, хто гэтага не разумее — не прыедзе.

— ***Менавіта так, але паўстаюць у рэгіёне чарговыя фэсты „з ідэяй”?***

— Так, на беларуска-ўкраінскім памежжы, здаецца, ладзяць іх за грошы шведскай амбасады, нават хіба па ініцыятыве самой амбасады. Ужо існуюць полацкае „Рок-кола” ці „Вольнае паветра” ў атмасферы фольк-музыкі, але думаю, што гэта не канкурэнцыя для нас.

— ***А на беларуска-літоўскім памежжы ў Нарвялішках? Там упершыню 24-26 жніўня адбудзецца новы фестываль, шэсць нацый на сцэне, з амбіцыямі спалучаць людзей дзякуючы музычнай культуры?***

— Гэта таксама новая думка, у якой няма нашага багацця — ідэйнай традыцыі. Усе сучасныя фестывалі паўстаюць на хвалі палітычнай папулярнасці Беларусі, гэтым самым гэта жэст салідарнасці. У нас фэст тыпова беларускі, а для прыкладу, паколькі не памыляюся, у Літве зайграюць два, максімальна чатыры, беларускія гурты.

— ***Часта, аднак, басаўскаму фэсту прыклейваюць ярлык палітычна заангажаванага мерапрыемства...***

— Гэта перад усім дзякуючы беларусам з Беларусі, якія паяўляюцца са значкамі „За свабоду”, якія прыязджаюць сюды стварацъ „Вольную Рэспубліку Басовішча”. Мы тое разумеем, але не адлюстроўвае гэта нашага напрамку.

— ***Апрача беларускіх гуртоў на „Басовішчы” зайграюць замежнікі, як у выпадку іншых фестываляў.***

— Так, зайграюць гурты з Польшчы, Літвы і Украіны, але не можна раўняць нас з іншымі фестывалямі. „Басовішча” было прыдумана перш за ўсё для беларускай меншасці ў Польшчы. Мае яно разбуджаць зацікаўленне нашых беларусаў, мае зацікавіць беларускай культурай, а ў выніку — грамадскімі падзеямі.

— ***А калі б стварыць такую іерархію важнасці...***

— Напэўна самае важнае — гэта прамоцыя беларускай культуры і ў галоўным музыкі, з другога боку хацелася б бачыць „Басовішча” як месца канфрантацыі музыкі суседскіх краін. Праўда, значна павялічваецца колькасць беларусаў з Беларусі, але і гэта не павінна абазначаць арганізатарскіх мэтаў.

19-21 ЛІПЕНЯ — ГАРАДОК

— ***Фестываль гэты не першы, а Ты прыхільнік паслядоўнасці. Ці маеш абсалютна сваю ўяву?***

— Я хутчэй паслядоўнік, але ўсё ж такі паклоннік уявы, каб пашырыць канцэпцыю на іншыя сферы культуры. Мабыць, удасца паказаць у Гарадку спектакль, а ноччу пасля канцэртаў у Барык вернецца кіно.

— ***На што можам спадзявацца ў гэтым годзе з музычнага боку?***

— З цікавейшых гуртоў можна будзе пабачыць „Крамбамбулю”. Гэта добры гурт, які варушыць публіку дзякуючы папулярнасці і весялосці. Ідуць перамовы з „Растай” — класным беларускім гуртом, які спявае на англійскай мове. Гэта новыя гурты на нашай сцэне. Напэўна цікава запрэзентуюцца таксама нашы сталыя госці, перад усім таму, што паявіліся новыя дыскі. Таму варта будзе паслухаць „Н.Р.М.”, „Таварыша Маўзэра”, „Краму”, вяртаючыся „Палац” ці тэатралізаваны „ЧпБ”.

— ***Не кажаш нічога пра польскае „Farben Lehre” ці „Тінь Сонца” з Украіны?***

— Польскі гурт патрэбны. Вядома, ён можа не арыгінальны, але перш за ўсё ён сам быў вельмі зацікаўлены ідэяй фэсту, то і дамовіліся. „Тінь Сонца” настолькі цікавы, што сам па сабе пачаў спяваць пабеларуску, казалі нават, што беларуская мова амаль як родная, а музыка супадае з фарматам фэсту.

— ***Ужо ведаем састаў конкурснікаў. Як ацэньваеш узровень?***

— Сітуацыя такая, што не будзе праблемы адабраць прынамсі трох пераможцаў. Журы не будзе хвалявацца за тое, ці ўзнагароджаны гурт заслугоўвае такога вылучэння. Я прыхільнік маладосці, таму такія гурты як „SKA!RB” паказваюць, што іграць цяжка — гэта не прынцып. З другога боку гурты як „Джамбібум” ці „Happy Three Friends” складана ацэньваць у адной катэгорыі з цяжкім рок-гучаннем.

— ***Хто будзе прадстаўляць польскі бок?***

— Не будзе ў конкурсе польскага гурту. Можа трэба памяняць твар фэсту. Маладым асацыюецца ён з цяжкай музыкай, а такія гурты можа проста ў нашым асяроддзі не паўстаюць.

— ***Гэта васемнаццаты Фестываль. Хочаш, каб Табе прыйшлося ладзіць юбілейную дваццатку?***

— Не, я ўжо буду застары, але „Басовішча” напэўна сарганізуе Беларускае аб’яднанне студэнтаў.

— ***Якая яго будучыня?***

— Напэўна ёсць патрэба мастацкага кіраўніка ды стварэння Рады фестывалю пра што і гутарылі мы апошні раз у лютым, але, вядома, што такую працу трэба будзе пачаць зразу пасля заканчэння сёлетняга выпуску.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

фота Ілоны КАРПЮК

Урачыстасць у Крыначцы

Крыначка раскінулася ў далі не на тэрыторыі Белавежскай пушчы, у адлегласці 3 км ад Гайнаўкі, пры шашы Гайнаўка — Белавежа. Малая царкоўка была тут узведзена ў 1848 годзе. За храмам знаходзіцца студня. Назва Крыначка ўзнікла нядаўна. У старых дакументах згадваецца ўрочышча Меднае. Гэтую назву замяніла Крыначка, вядомая цудадзейнай крыніцай, а не ручаём. Ніводныя друкаваныя матэрыялы, ні дакументы не згадваюць пра гэтае святое месца. Існуе толькі легенда.

Старажылы сцвярджаюць, што традыцыя шанавання гэтага месца сягае пачаткаў хрысціянства на гэтай тэрыторыі. Пачатак ёй далі манахі Кіева-Пячэрскай лаўры, якія хаваліся тут ад манго-ла-татарскіх набегаў. Пашыралі яны сярод жыхароў пушчы праваслаўную веру, маліліся над жывацворнай крыніцай.

Першымі пілігрымамі да гэтага месца былі віленскія манахі. Тут спыняліся яны на адпачынак, маліліся Богу разам з мясцовым насельніцтвам. Традыцыя гэтая працягваецца да нашых дзён. Цяпер галоўныя святкаванні адбываюцца тут на Тройцу.

Сёлета паломнікі маліліся на Крыначцы 28 і 29 мая. Сабраліся тут праваслаўныя і іншаверцы з Падляшша і іншых рэгіёнаў Польшчы, якія вераць у цудадзейную моц вады са святой крыніцы. Як даўней, так і цяпер паломнікі абмываюць вадой хворыя месцы, а хустачкі пакідаюць на дрэвах і агароджы.

Найбольш вернікаў сабралася на вячэрні ў панядзелак, 28 мая. На другі дзень літургію здзейснілі епіскапы Міран і Грыгорый у саслужэнні шматлікага духавенства. Пасля багаслужбы епіскап Міран падзякаваў усім сабраным за малітву на гэтым святым месцы. Асаблівыя словы падзякі іерарх накіраваў войту Гайнаўскай гміны Вользе Рыгаровіч за пракладку электрычнага асвятлення, Гайнаўскаму надлясніцтву за добраўпарадкаванне пляцоўкі вакол храма і дырыжору ды членам хору Дубінскага прыхода. Затым сабраныя пайшлі з хрэсным ходам да студні, дзе быў здзейснены чын водаасвячэння.

Тэкст і фота Андрэя ЯЛОЗЫ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

А ці зарабіў ты на канікулы?!

Цяжкавата было сёлета дачакацца 22 чэрвеня, заканчэння школьнага навучальнага года! Вінаватае надвор'е. Канец мая і пачатак чэрвеня хутчэй напаміналі спякотны ліпень з маланкамі і дажджамі. Дарэчы, добры прагноз для ўраджаю.

А які плён сабралі мы ў канцы школьнага года? Якія ў нас дасягненні? Поспехі? А можа паразы? Якія выспеюць з іх планы на будучыню? Тут кожны сам павінен падвесці вынікі. Вядома, цудоўна, калі ў якасці доказу нашай працы ў руках трымаем пасведчанне з бел-чырвонай палоскай. Або грамату за поспехі ў прадметным ці мастацкім конкурсе.

Мы таксама зрабілі падлік самых значных падзей на працягу 2006/07 школьнага года, якія адзначаліся на старонках „Зоркі". З гэтай перспектывы год паказаўся даволі плённым, багатым на конкурсы і святкаванні. І творчым. Тут маем на ўвазе „Муху ціп-топ" — цыкл літаратурна-карцінкавых гісторый з жыцця гарадской гімназіі, які выспяваў пад нашымі рэдакцыйнымі крыламі. Але не толькі. Адным з цікавейшых журналісцкіх дэбютаў года трэба назваць артыкулы гімназісткі Касі Сянкевіч з Нарвы. Прыстойна бачацца дэбюты Івоны Баршчэўскай з Орлі і Асі Трусевіч з Нараўкі. У пачатку навучальнага года выйшаў з друку зборнік апавяданняў „Дзяўчынка і хмарка" Міры Лукшы (раней напісаных для „Зоркі"). Зараз мы пачынаем друкаваць цыкл гумарыстычных аповедаў Дзядзечкі Сіда...

Фота Наталлі ШВЕД

Аднак, калі глянуць на мерапрыемствы, мінулы навучальны год трэба назваць юбілейным. Наш першы артыкул — пра дзесяцігоддзе парафіяльнага хору „Рамонка" з Ласінкі. Юбілей адзначалі 9 верасня мінулага года. У кастрычніку мы святкавалі 50-годдзе „Нівы" і з гэтай нагоды аб'явілі „Залаты конкурс". У сакавіку залаты юбілей літаратурнага дэбюту адзначаў наш паэт Віктар Швед. А ў чэрвені — пяцігоддзе калектыву „Незабудкі" з Арэшкава ды дзесяцігоддзе беларускага школьніцтва ў Беластоку.

Як кожны год, адбыліся цыклічныя мерапрыемствы — дэкламатарскі, тэатральны і песенны агляды. Маем лаўрэатаў прадметных конкурсаў. У Чыжах, Гайнаўцы, Нарве, Орлі, Беластоку ладзіліся беларускія калядныя і карнавальныя мерапрыемствы. Упершыню ў ПШ н-р 6 у Гайнаўцы і Орлі былі наладжаны „Дні беларускай культуры" ў школах.

Калі ідзе пра самастойныя прыклады творчай актыўнасці, дык тут трэба згадаць беларускіх ліцэістаў, якія наладзілі фотаздымачную студыю (з бел-чырвона-белымі матывамі) з нагоды 25-га Сакавіка. Вялікім дасягненнем беластоцкай моладзі ёсць таксама запіс двух кампакт-дыскаў з каляднымі і рэкруцкімі песнямі. Прытым сам запіс гэта не мэта сама ў сабе. Беластоцкая моладзь ужо расспяваная. І гэта так, што ўмее зачараваць сваімі песнямі слухачоў. Так было ў час святкавання 10-годдзя, якое праходзіла 15 чэрвеня пад спякотным беластоцкім небам.

Гэта, адначасова, была развітальная сустрэча са школай. З кветкамі і словамі падзякі для настаўнікаў.

ЗОРКА

ПІСТОРЫЯ АБ СРОДКУ, ЯКІ ДАПАМАГАЕ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ КОЛЕР ДЗЯВОЧЫХ ВАЧЭЙ

Здарылася так, што хлопец Янка раптам адчуў, як ягоныя вочы ўсё часцей спыняюцца на дзіўнай постаці дзяўчынкі па імені Веранічка. І тады яму вельмі захацелася, каб і дзявочыя вочы таксама знайшлі яго. Знайшлі і спыніліся, неадрыўна гледзячы ў вочы ягоныя... Але і сродак тут павінен быць радыкальнейшы! — падумаў Янка. І, не марудзячы, выкаціў самы таўшчэзны барабан ды пачаў ну проста-такі горда малаціць-лупіць у яго раз-пораз кулакамі, але нашмат часцей — сваім геройскім ілбом! Вядома, барабан разам з хлапечым ілбом трэснулі не раўнуючы як тыя пераспелыя кавуны, што растуць у маім агародзе, а дзяўчынка Веранічка нават і брывом на Янку не павяла. Тады ён пайшоў да знаёмых вадалазаў, пазычыў у іх вадалазаўскую амуніцыю ды, ушчаперыўшы на сябе ўсю гэтую батыскафію, разбегся ды з усяе сілы грымбабохнуўся аб цягляны мур, калі Веранічка праходзіла міма. Ага, як ішла яна сабе, так і пайшла. Урэшце Янка, усё ў той жа батыскафіі, выкаціў з пуні дзедаўскую матацыклетку, завёў і, ускочыўшы на яе нагамі ў поўны рост, пачаў з неміласэрным матацыклетным ровам кружляць вакол Веранічкі, у выніку чаго яна па-ранейшаму глядзела некуды ўдалячынь... а Янка лагічна і трапна лёг усім сваім шкілецікам спачатку на асфальт, а яшчэ праз хвілінак 15-20 і ў марлева-гіпсавае шкарлупінне ў бліжэйшым шпіталі.

А наступным днём у палату да Янкі зайшла дзяўчынка Веранічка і паклала яму на ложак жывыя, пахнуткія кветкі. І гэтак неадрыўна-неадрыўна паглядзела ў ягоныя вочы.

І тут Янка раптам уведаў, што яму трэба было зрабіць, каб разгледзець да драбнюткіх драбнютачак колер дзявочых вачэй...

Дзядзечка СІД
21 чэрвеня 2007 г.

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 36 —

У апошні тыдзень навучальнага года ў нашай гімназіі адбыўся форум класаў. Большасць вучняў не хацела ўжо нічога рыхтаваць пад гэтую імпрэзу, аднак я і мае сябры вырашылі прыдумаць нешта „супер” і заваяваць галоўную ўзнагароду. Наша выхавацелька не падтрымала нас, яна нават не прыйшла на форум класаў. Таму ў апошні панядзелак, 18 чэрвеня, мы выйшлі на сярэдзіну гімнастычнай залы з аўтарскім спектаклем „Следства ў справе смерці Мэрлін Манро”. Нашай пастаноўкі не бачыла ні адна дарослая асоба. Не мушу вам хіба пісаць, што наш клас быў вельмі ўпэўнены ў сваім акцёрстве ды ніхто не хваляваўся перад выхадам на сцэну. Мы падрыхтаваліся, так сказаць, на хаду. У пятніцу Ганка раздала ўсім сцэнарый, раздзяліла ролі, дадаткова мы прыдумалі два танцы, а ў суботу мы сустрэліся, каб навучыцца песень. У нядзелю было такое цудоўнае надвор’е, што ў панядзелак — у дзень выступлення, ніхто не ўмеў прачытаць з памяці сваёй ролі. Я, Ганка і Соня іграліі дэтэктываў, таму схавалі свой тэкст у сшыткі, якія ляжалі на нашым стале. Кася, якая выконвала ролю галоўнай гераіні Мэрлін Манро, вывучыла тэкст на гадзіну да выступлення. Матвейка, наш вялікі абібока, нават не пакарыстаўся прыкладам Касі і сваю ролю напісаў сабе на руцэ.

— Як гэта будзе выглядаць, калі будзеш чытаць з рукі? — усхвалявалася Ганка.

— Ну, але я іграю „псіха” і гледачы падумаюць, што гэта так трэба! — бараніўся хлапец.

Іншыя асобы, напрыклад, Ігар, які іграў нарачонага Мэрлін, ці Ксэня, якая была яе саперніцай, мелі вельмі кароткія ролі і ўвогуле нічым не пераймаліся...

Перад намі выступілі ўсе першыя класы. Паводле мяне гэта былі не надта цікавыя выступленні, з дзеравяным акцёрствам і банальным рэпертуарам. Настаўнікам вельмі спадабаўся спектакль I „а” класа, у якім расхвальваліся настаўнікі нашай гімназіі. Вучням гэтая пастаноўка зусім не падышла да густу, наадварот, нас хвалявала падхалімства і непраўдзівасць тэкстаў. Акцёры з I „а” іграліі як вязні ў турме, якіх прымусілі заняцца культурай...

Мы выступілі ў канцы прэзентацый, таму што ні адзін з другіх ці трэціх класаў не прыйшлі на форум. У зале было ўжо мала гімназістаў — большасць публікі проста даканалі ранейшыя выступоўцы. Нам вельмі дрэнна іграліся пры малой публіцы, хаця ў нас быў жывы і інтэлігентны сцэнарый, песні і танцы. Нашая драма кранала праблему мастацтва і цаны, якую трэба заплаціць за сапраўднае акцёрства!

Паводле рашэння журы мы занялі... перадапошняе месца! Праўда, ужо на пачатку, калі мы пабачылі хто з’яўляецца сябрам журы (Нягарчук, Ляскоўскі, Воўк), у нас з’явіліся чорныя прадчуванні (усе яны ганарыліся тым, што абмінаюць тэатр шырокім кругам!).

Як вы пэўна дадумаліся, пераможцамі сталі дзеравяныя акцёры з I „а” класа. Спачатку нам стала вельмі сумна, што ў нашай школе ўзнагароджваюць падхалімаў. Але калі мы даведаліся, што галоўная ўзнагарода — гэта пірог, які спякла спадарыня Воўк, мы не мелі ўжо так дрэнных настрояў. Лаўрэаты першага месца таксама не выглядалі на шчаслівых, калі атрымлівалі ўзнагароду.

Тэкст: <natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@tlen.pl>

Вершы Віктара Шведа

Найбольш верныя сівыя

Юнак звяртаецца да таты
З цікавым пытаннем гэткім:
— Скажы, больш верныя дзяўчаты
Бландзінкі ці брунеткі?

Тата адказвае: — Мой сыне,
Парады мае такія:
Па-мойму, верныя дзяўчыны
Найбольш ужо сівыя.

У гарадскім аўтобусе

Аўтобус надта поўны, драма,
Тут сварацца няспынна.
— Што ты так пхаешся „на хама”,—
Лаецца нейкі мужчына.

Агрызаецца незнаёмы,
Быццам вінаваты:
— У цеснаце адкуль вядома
На каго натрапіш.

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Якуб Філіпчук — Бельск-Падляшскі

Іаанна Леанеўская — Нараўка

Юстына Апольская — Беласток

Ганя Піскорская — Гайнаўка

Польска-беларуская крыжаванка № 26



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 22: Сумка, арэшак, поклад, раўнавага, кут, ода, Ас, лом, мастак, хам. Шар, рута, шэпат, шоў, акно, склад, авал, мода, ох, гама, адрас.

Любяць сваю мову

Хаця колькасць вучняў у Падставовай школе і Публічнай гімназіі ў Нарве скарачаецца, лік навучэнцаў беларускай мовы ў абедзвюх школах, якія змяшчаюцца ў адным вялікім будынку, павялічваецца. Зараз беларускай мове вучыцца 126 школьнікаў, якія вельмі ахвотна ўдзельнічаюць у беларускамоўных конкурсах і часта ў іх перамагаюць. Ахвярная работа настаўніцы беларускай мовы Ніны Абрамюк дае вельмі добрыя рэзультаты. Каля 15 яе вучняў сталі ўжо лаўрэатамі, а больш за 5 асоб — фіналістамі Прадметнага конкурсу беларускай мовы. Цяжка ўжо злічыць шматлікіх пераможцаў дэкламатарскіх і „гавэндзярскага" конкурсаў, падрыхтавацца якім дапамагала спадарыня Абрамюк. Дзеткі і моладзь кожны год рыхтуюць па 4-5 тэатральных пастановак на беларускай мове, з якімі выступаюць на школьных мерапрыемствах. Старэйшыя вучні цікавяцца мясцовымі абрадамі і збіраюць фальклорны матэрыял.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні Падставовай школы і гімназісты — пераможцы беларускамоўных конкурсаў — з настаўніцай Нінай Абрамюк

Каб ахвотна вучыліся па-беларуску

— Каб павялічыць колькасць навучэнцаў беларускай мовы, трэба было многа працаваць з вучнямі і паказваць іншым дзеткам і бацькам рэзультаты нашай работы. Калі нашы вучні станавіліся лаўрэатамі Прадметнага конкурсу беларускай мовы і пераможцамі беларускамоўных дэкламатарскіх і „гавэндзярскага" конкурсаў, мы маглі нашы поспехі прэзентаваць перад нашай школьнай публікай. Праца з моладдзю без конкурсных поспехаў не прыцягвала б так дзетак да вывучэння роднай мовы, — тлумачыць настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк. — Пра нашых вучняў, якія дабіваюцца поспехаў, пішуць у часопісах, паказваюць іх па тэлебачанні і гэта бачаць іншыя бацькі, якія пасля рашаюцца пасылаць сваіх дзетак на ўрокі беларускай мовы.

Бацькі сустракаюцца з беларускім словам на школьных мерапрыемствах. Вучні выступаюць з беларускімі пастаноўкамі і дэкламацыяй па-беларуску ў час калядных святкаванняў, Дня маці і Дня бабуль і дзядуляў. Гімназісты рады, што ладзяцца сустрэчы з вучнямі Гарадоцкай школы, у час якіх ёсць нагода паказацца з беларускай праграмай, пазнаёміцца з сябрамі з іншай школы ды супольна пагуляць. Моладзь нарваўскіх школ ахвотна адпраўляецца на экскурсіі. Нядаўна вучні былі ў рэдакцыях „Нівы" і „Рацыі", наведалі Студзіводскі музей, збіраюцца паехаць у Скарышэва да Міхала Фільяновіча.

— Я люблю працаваць з вучнямі і нешта для іх рабіць. Калі відаць рэзультаты працы, то гэта заахвочвае да яшчэ большай актыўнасці. У выпадку навучання беларускай мовы конкурс гоніць конкурс, паміж імі мы ладзім розныя мерапрыемствы, а да некаторых малодшыя дзеткі рыхтуюцца нават па некалькі месяцаў, — расказвае спадарыня Абрамюк і звяртае ўвагу на актыўнасць бацькоў, якія многа дапамагаюць у час мерапрыемстваў, асабліва арганізаваных для наймалодшых дзетак. Настаўніца ўспамінае таксама пра дырэктараў Падставовай школы Аліну Асташэўскую і Гімназіі Аліну Кананюк, якія аказваюць падтрымку беларускім мерапрыемствам і школьным конкурсам. Работу з вучнямі замаруджваюць нястачы незалежныя ад школы. Не хапае метадычных распрацовак урокаў і сцэнарыяў, паводле якіх можна было б рыхтаваць мерапрыемствы. Вучні ахвотна купілі б польска-беларускія і беларуска-польскія слоўнікі, якія намнога аблягчылі б ім работу.

Мае маладыя суразмоўцы заяўляюць, што цікавяць іх мясцовыя традыцыі. У школе дзейнічае невялікі музейчык, да якога экспанаты прыносілі самі вучні і іх бацькі. Ёсць там прыгожыя ручнікі, макаткі і іншае рукадзелле. Побач глінянага посуду знаходзяцца там даўнія рэчы хатняга ўжытку і прылады для апрацоўкі ільну. На сустрэчы прыязджала ў школу спадарыня Анна Комар з Макаўкі з расказамі пра велікодныя абрады.

— Мы ў нашым музейчыку праводзім таксама ўрокі беларускай мовы. Знаёмімся з даўнімі заняткамі ці старымі вырабамі, — тлумачыць настаўніца беларускай мовы. Зараз гімназісты і вучні шостага класа збіраюць матэрыялы аб мясцовых вясельных, велікодных і калядных абрадах. Раней моладзь збірала прыказкі, прымаўкі і выдала іх у адмысловым зборніку.

— Ужо з дзеткамі трэцяга класа я пачынаю гаварыць пра іх нацыянальную тоеснасць, а больш на гэтую тэму гаворым мы з вучнямі гімназіі, — заяўляе настаўніца Ніна Абрамюк.

Аб нацыянальнай тоеснасці і патрэбе ведання роднай мовы гавораць мне гімназісты і старэйшыя вучні Падставовай школы, якія сёлета або ў мінулых гадах перамагалі ў конкурсах.

— Я лічу, што трэба ўмець гаварыць па-свойму, каб зберагчы нашу мову ад забыцця. Мае бацькі — беларусы і я лічу сябе беларускай, — гаворыць Паўліна Дзмітрук-Лапінская з Кавылы, якая зараз вучыцца ў трэцім класе Гімназіі і будзе паступаць у Гайнаўскі белліцэй.

— Беларуская мова — гэта мова нашых продкаў і трэба яе ведаць. Заняткі па беларускай мове цікавыя, бо ў час іх мы гаворым аб мінулым нашага наваколля і гісторыі Беларусі. Да дадатковай працы заахвочваюць нас шматлікія конкурсы, — кажа Малгажата Харкевіч, а Каміля Кірыловіч хваліць сваю настаўніцу беларускай мовы за цікавыя аповеды на занятках.

Перамагалі ў беларускамоўных конкурсах

Міхал Кананюк з Васькоў, мінулагодні лаўрэат Прадметнага конкурсу беларускай мовы для падставовых школ, любіць гаварыць па-беларуску, а з бацькамі размаўляе яшчэ пасвойму. Ягоная сяброўка Агнешка Апольская, таксама лаўрэатка, звяртае ўвагу на цікавыя заняткі па-беларуску ў школе. Настаўніца беларускай мовы нядаўна падвяла вынікі беларускамоўных конкурсаў, якія аказаліся вельмі добрымі. На працягу апошніх чатырох гадоў у Нарваўскай гімназіі заўсёды былі лаўрэаты Прадметнага конкурсу беларускай мовы (Эвеліна Прабуцкая, Эвеліна Келбашэўская, Паўліна Дзмітрук-Лапінская, Эдыта Хілімнюк, Кацярына Сянкевіч і Аліцыя Міранчук) і фіналісты. Гімназістка Малгажата Харкевіч заняла другое месца ў Конкурсе беларускай гавэнды ў Гайнаўцы, а Марыянна Садоўская заняла трэцяе месца на цэнтральных элімінацыях Дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". У Прадметным конкурсе беларускай мовы для падставовых школ у гэтым годзе лаўрэаткай стала Юліта Кур'яновіч. Дамініка Юшкевіч заняла першае месца ў Конкурсе расказчыкаў у Гайнаўцы і трэцяе месца на цэнтральных элімінацыях конкурсу „Роднае слова" (Крыстыян Венцка атрымаў вылучэнне), а многія вучні Нарваўскай школы перамагалі на раённых элімінацыях.

— Каб былі поспехі ў конкурсах, трэба вельмі многа працаваць з вучнямі на пазаўрочных занятках. Рыхтуючы дзетак да прадметных конкурсаў, я пачынаю сустракацца з імі ад пачатку школьнага года, па некалькі разоў на месяц, а пасля намнога часцей, — кажа настаўніца Ніна Абрамюк. Пра вельмі доўгую і старанную падрыхтоўку да прадметнага конкурсу гаварыла таксама гімназістка Эвеліна Прабуцкая.

— Наша настаўніца цікава вядзе заняткі па беларускай мове і многа нам расказвае аб даўніх традыцыях, — кажа іншая лаўрэатка Эвеліна Келбашэўская. — Найбольш я люблю беларускую літаратуру і ахвотна чытаю беларускія вершы.

Ужо ад некалькіх гадоў у школе ладзіцца „Вялікае чытанне" на беларускай мове. Дзеткам і моладзі прапануюцца тэксты, на якіх яны вучацца правільна чытаць, звяртаючы ўвагу на вымаўленне, пунктуацыю і інтанацыю. У час конкурсу вучні змагаюцца толькі з адным расказам ці фрагментам большага апавядання. У гэтым годзе „Вялікае чытанне" адбылося 14 мая, а ўзнагароду Гран-пры заваявала Уршуля Беразавец.

— Тэксты для чытання я падбіраю залежна ад узросту вучняў так, каб ва ўсіх класах падставовай школы і гімназіі былі розныя матэрыялы. Дзетак і моладзь ацэньвае школьная камісія і вучні кожнага класа атрымліваюць узнагароды, — гаворыць спадарыня Ніна. — Я хацела б, каб гэты конкурс выйшаў па-за школу і можна было ладзіць міжшкольныя спаборніцтвы па мастацкім чытанні.

Нарваўскія вучні, якія ходзяць на заняткі па беларускай мове, першы раз прыступілі ў гэтым годзе да Конкурсу праваслаўнай рэлігійнай паэзіі, які ладзіўся ў Беластоку. Падрыхтавалі яны беларускія тэксты. Гімназістка Марыянна Садоўская заняла другое месца, а вучаніца Падставовай школы Магдаліна Каранецкая — трэцяе месца (вылучэнні атрымалі Караліна Астапкевіч, Аляксандра Сіманчук, Пётр Лапінскі, Магдаліна Бобік і Віялета Чарнякевіч). Настаўніца заяўляе, што вучні вельмі ахвотныя да ўдзелу ва ўсіх беларускамоўных конкурсах, а размова з вучнямі пацвярджае гэтае. Кажуць яны, што любяць вучыцца, дэкламаваць па-беларуску і таму ахвотна ўдзельнічаюць у прадметных і дэкламатарскіх конкурсах. Аднак, каб перамагчы, трэба сур'ёзна папрацаваць.

Аляксей МАРОЗ

Універсітэт у Беластоку — дзесяцігоддзе

19 чэрвеня адбылося ўрачыстае пасяджэнне Сената вучэльні

„Малады, дынамічны, з перспектывамі" — такі лозунг пра наймаладзейшую ў Беластоку вышэйшую навучальную ўстанову віднеў на юбілеі Універсітэта ў Беластоку. Мінула якраз дзесяць гадоў ад часу, як „дачка" Варшаўскага універсітэта дарасла да самастойнасці. 19 чэрвеня 1997 года ўступіў у сілу закон (Dz.U. Nr 102, poz. 642) аб тым, што дзейнічаючая ад 29 гадоў Філія Варшаўскага універсітэта ў Беластоку стала незалежнай вучэльняй. З гэтай нагоды 19 чэрвеня праз дзесяць гадоў адбылося ўрачыстае пасяджэнне Сената вучэльні, з успамінамі, хронікай, узнагародамі і віншаваннямі. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел прадстаўнікі самаўрадавых улад рэгіёна і горада ды ўрада, каталіцкае і праваслаўнае духавенства, рэктары беластоцкіх і польскіх навучальных устаноў. Былі прысутныя таксама апошні прэзідэнт РП у эміграцыі Рышард Качароўскі, а таксама былы прэм'ер Владзімеж Цімашэвіч, пра якога заслугі ў заснаванні універсітэта і падтрымку прагучала нямала цёплых слоў. Таксама як і пра прафесара Адама Чэслава Дабронскага (ПСЛ), які кіраваў у Сейме камісіяй па справах стварэння універсітэта ў Беластоку і якому ўдалося пераканаць аб магчымасцях і патрэбах Беласточчыны калег-дэпутатаў і сенатараў, нават калі пералік мінусаў быў даўжэйшы ў той час чым плюсаў у неабходных магчымасцях узнікнення беластоцкай вучэльні.

Рэктар Універсітэта ў Беластоку прафесар Ежы Нікітаровіч, які быў выбраны на пасаду 1 верасня 2005 г., спецыяліст у галіне міжкультурнасці, рэгіянальнай адукацыі, грамадскай педагогікі і сацыялогіі сям'і, з беластоцкай вучэльняй звязаны ад 1987 г., хоць узнёсла цешыўся дасягненнямі хутка развіваючагася універсітэта, пералічыў тыя недахопы, як праблемы з адпаведнымі кадрамі — перш за ўсё надахоп прафесараў (на месца адыходзячых на пенсію па прычыне ўзросту ўсё не хапае новых з адпаведнымі званнямі выкладчыкаў, па прычыне кадравых недахопаў не ўдаецца стварыць спецыяльнасці псіхалогіі (якая прадбачана ад дзесяці гадоў, а факультэт мае назву „педагогікі і псіхалогіі") ці Інстытута беларусістыкі, усё ненайлепшую дыдактычную базу — будынкі раскінуты па ўсім горадзе, не хапае добра абсталяваных лабараторый, сучасных мультымедыйных праграм — таму паявіліся мары і планы аб сучасным акадэмічным кампусе (хоць універсітэт не мае ні тэрыторыі на яго, ні сродкаў), пакуль не поўна ажыццёўлены мары аб філіі універсітэта ў Вільні, малыя стыпендыі, пакуль нізкае месца ў рэйтынгу польскіх вучэльняў. У пераліку „плюсаў" на першым месцы апынулася пабудаванне за 6 гадоў гмаху ў сем паверхаў універсітэцкай бібліятэкі імя Ежы Гедройца (каштавала гэта 31,5 млн. зл.), здача ў карыстанне (у дзень юбілею) спартыўнай залы па вул. Свярковай (6 млн. зл.), рамонт будынкаў юрыдычнага і эканамічнага факультэтаў, узнікненне ў 1999 г. кафедры праваслаўнай тэалогіі, навука беластоцкіх студэнтаў у замежных вучэльнях перш за ўсё ў рамках праграмы Сакратас-Эразмус, правы да назначання звання габілітаванага доктара і магчымасці дактаратаў (самастойны універсітэт мусіць мець столькі працаўнікоў, каб на 12 спецыяльнасцях магчы прысвойваць званні доктараў).

— Будучыня сама па сабе не даецца нікому, трэба яе фармаваць самому. Мы, як малады універсітэт, мусім скарачаць дыстанцыю, якая аддзяляе нас ад іншых вучэльняў у краіне. Перад намі шмат выклікаў, шмат працы, — адзначыў рэктар.

Першы раз у гісторыі вучэльні былі ўручаны „Медалі універсітэта ў Беластоку".

Атрымалі яго м.інш. першы рэктар універсітэта праф. Адам Ямруз, цяперашні суддзя Канстытуцыйнага трыбунала, а таксама званне „Заслужанага для Універсітэта". Адной з найбольш заслужаных асоб для ідэі ўзнікнення Універсітэта ў Беластоку з'яўляецца Ежы Гедройц, аб чым неаднаразова ўспаміналася на юбілеі (дзякуючы таму хоць Бібліятэка носіць яго імя). Гэтак выказваўся ён быў у 1999 г. на яго тэму, ды шырэй — аб магчымасцях і місіі гэтага месца: „Універсітэт у Беластоку толькі шукае свае дарогі, якой пакуль што не знаходзіць, а мог бы стаць П'емонтам непадлеглай беларускай думкі". Ідэя ўзнікнення Інстытута беларусістыкі ва універсітэце, на жаль, пакуль упала і адкладзена „ad acta", а магла б быць арганізацыйным ядром дзеянняў універсітэта ў гэтым напрамку.

Праф. Ежы Нікітаровіч сцвярджае, што Беласток не ўпусціў шчаслівага, непаўторнага моманту на стварэнне самастойнай вучэльні.

— Калі б мы яго ўпусцілі, не рашыліся на самастойнасць, то б універсітэт у Беластоку не існаваў бы. Мы — вучэльня маладая, якая прабуе паказацца ў розных дысцыплінах. Ёсць у нас 20 спецыяльнасцей, 16 тысяч студэнтаў. Моцны навуковы асяродак гэта таксама шанц для горада, рэгіёна і іншых навучальных устаноў. Што можам запрапанаваць? Інтэрдысцыплінарнасць, макраспецыяльнасці. Гэта шанц для ўсяго Падляшша.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Важныя нашыя прафесары: злева Андрэй Садоўскі з Тыневічаў, Міхал Кандрацюк з Дубіноў, Ежы Нікітаровіч (рэктар) з Мельніка. А можа прагаласуем за Інстытут беларусістыкі?

Прафесар Галіна Твараровіч з беларускай філалогіі. А можа варта ставіць на беларускасць?

У Гданьску адкрылі помнік Янку Купалу

23 чэрвеня ў польскім Гданьску да 125-годзьдзя з дня нараджэньня адкрыты мэмарыяльны знак у гонар вялікага беларускага паэта Янкі Купалы — на вялікім камяні шыльда (фінансаваная кансулятам Беларусі ў Варшаве) з надпісам па-беларуску, прычым паводле клясычнага правапісу, і па-польску: „Янка Купала — Беларускі пясьняр" і „...сьняцца сны аб Беларусі".

Адкрыцьцё мэмарыяльнага знаку ў ціхім, маляўнічым раёне Гданьску, на

вуліцы, якая таксама носіць імя Янкі Купалы, адбылося ў надзвычай урачыстай атмасфэры.

Мэр Гданьску Павал Адамовіч, прызнаўшыся, што ягоны род паходзіць зь Беларусі, сказаў, што ганарыцца тым, што ў ягоным горадзе паўстаў такі помнік.

Адамовіч: „У кожным з вас цячэ значная частка беларускай крыві, бо ў Гданьску сапраўды шмат людзей, якія паходзяць зь Беларусі. Мы гэтым ганарымся і, дзякуючы Купалу, яшчэ раз усьведамляем".

Мэмарыяльны знак быў усталяваны дзякуючы намаганьням перадусім беларускай грамады Гданьску на чале са спадарыняй Аленай Глагоўскай.

Глагоўская: „Цяжкасьці былі з тэрмінам адкрыцьця. Казалі мне з амбасады беларускай: „Можа ўвосень давайце". Я кажу: „А што восеньню? Што такога восеньню адбываецца?" Пажартавала нават — не ў гадавіну ж рэвалюцыі кастрычніцкай адкрываць! Але трэба сказаць, што кансулят беларускі выканаў шыльду такую, якую трэба", — тут спадарыня Глагоўская зьвярнула ўвагу на напісаньне слова „сьняцца" паводле клясычнага правапісу.

У адкрыцьці мэмарыяльнай шыльды ня ўзяў удзел амбасадар Беларусі ў Польшчы. Прысутныя на цырымоніі беларускія дыпляматы патлумачылі гэта тэрміновымі справамі ў Варшаве, хаця яшчэ ўчора Павал Латушка быў у Гданьску.

Адзін з прадстаўнікоў мясцовай беларускай грамады сказаў нашаму радыё, што гэта магло быць зьвязана з „небясьпекай" зьяўленьня на цырымоніі вялікай колькасьці бел-чырвона-белых сьцягоў, як зрэшты і было.

Студэнт: „Я беларус, жыву тут, вучуся і лічу сваім абавязкам быць на такім мерапрыемстве", — кажа студэнт, які разам са сваімі сябрамі прыйшоў на цырымонію зь бел-чырвона-белым сьцягам.

Напярэдадні мясцовая прэса пісала, што кіраўніцтва кансуляту запатрабавала ад арганізатараў, каб хор, які сьпяваў на цырымоніі, не выконваў песьню на верш Купалы „Паўстань, народ", бо „яна не адпавядае цяперашняму часу".

Генэральны консул Беларусі ў Гданьску Руслан Есін, аднак, заявіў нашаму радыё, што ніякіх спрэчак у беларускіх дыпляматаў з арганізатарамі не было.

Аляксей Дзікавіцкі, Гданьск
www.svaboda.org

http://gymn4.minsk.edu.by

МІНСКАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ГІМНАЗІЯ № 4

У Беларусі, як вядома, вельмі мала ўстаноў адукацыі з беларускай мовай навучання. Вышэйшых увогуле няма. Такая сітуацыя можа здзіўляць каго заўгодна, толькі не ўласна беларусаў. Яны прызвычаіліся цурацца роднай мовы і таму наяўнасць нейкай школы з беларускай мовай навучання (як у Беларусі, так і на Беласточчыне) часцяком выклікае паважліва-здзіўленае стаўленне. Паважлівае — бо толькі з павагай можна адносіцца да людзей, якія не саромяцца быць беларускамоўнымі, а здзіўленае — бо цяжка зразумець навошта ім гэта патрэбна і якую карысць можа прынесці?

Не будзем адхіляцца ад выпрацаваных нашай нацыяй стэрэатыпаў і са здзіўленай павагай зазірнём у адну з нешматлікіх гімназій, дзе навучанне вядзецца па-беларуску. Зразумела, зрабіць мы гэта зможам толькі віртуальна, набраўшы на сваім камп'ютэры адрас у Інтэрнэце **http://gymn4.minsk.edu.by**.

Праз гранатова-блакітнае выяўленне першай старонкі нібы прабіваюцца промні сонца, якіх імкнуцца закрыць хмары. На гэтым фоне месціцца назва — Мінская беларуская нацыянальная гімназія № 4. Астатняя форма падачы інфармацыі не надта ўражвае. Яна звычайная і ўяўляе з сябе дзяленне старонкі на дзве часткі. У левай месцяцца выйсці да рубрык, здымак гімназіі і яе адрас, а з правага боку знаходзяцца падрабязныя расповеды. Як часцяком бывае на першай старонцы, тут месцяцца навіны. Зразумела, канец навучальнага года і ўсё, што з ім звязана, з'яўляецца галоўнай тэмай апошніх паведамленняў.

Больш падрабязна аб гімназіі можна даведацца ў адмысловай і аднайменнай рубрыцы. Чытачы „Нівы", мяркую, з нечаканасцю даведаюцца, што тэрмін навучання ў гімназіі ў Беларусі адрозніваецца ад такога ў Польшчы. Напрыклад, у данай гімназіі прадугледжана навучанне дзяцей, якія па сваім узросце на польскай тэрыторыі ідуць у ліцэй. Не трэба здзіўляцца, бо выразна структураванай градацыі навучання ў Беларусі зараз не існуе. Таму дзеці ад 14 да 17 гадоў могуць вучыцца і ў гімназіях, і ў ліцэях, і ў каледжах, і ў вучылішчах, і ў школах, і ў тэхнікумах. Назвы там маюць другаснае значэнне.

На данай старонцы цікавай з'яўляецца падрубрыка „Сімволіка гімназіі". Яна складаецца са сцяга, эмблемы і гімна. Цяжка зразумець чаму, але, па ўсім відаць, што распрацоўшчыкам як сайта, так і сцяга надта падабаецца сіні колер.

Наступная вартая ўвагі старонка называецца „Вучням". Тут распавядаецца аб розных факультатывах, гуртках, грамадскіх арганізацыях, якія дзейнічаюць у гімназіі. Паколькі гэта дзяржаўная ўстанова, то, зразумела, без праўрадавага БРСМ (Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі) тут не абышлося. Цешыць, праўда, тое, што колькасць яго членаў найменшая ў параўнанні з іншымі гімназічнымі аб'яднаннямі.

Старонка „Бацькам" распавядае як і што трэба рабіць, каб іхняе дзіця было прынятае ў пачатковую школу пры гімназіі, а потым і ў гімназію. Пры ўстанове працуе клуб сацыяльна-псіхалагічнай і педагагічнай дапамогі, куды стваральнікі сайта раяць звяртацца пры ўзнікненні падобных праблем.

Працуе на сайце і віртуальная прыёмная, дзе інтэрнэт-карыстальнікі могуць задаць свае пытанні. Такіх жадаючых не надта многа, але паказальным ёсць пытанне, якое „вісіць" на сайце ўжо роўна год: „Правда ли, что обучение в гимназии идет с первого класса на белорусском языке?"

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

З дэбютантаў — у лепшыя

Па традыцыі ў чэрвені падводзяцца вынікі на вызначэнне лепшых у нацыянальным баскетболе і хакеі. Такія апытанні, якія выклікаюць значную цікавасць, праводзіць папулярная спартовая газета „Прессбол".

Мацнейшы хакеіст года называецца з 1990 года. Найбольшага лаўрэацтва заслужыў шматгадовы галкіпер нацыянальнай дружыны Андрэй Мезін — у яго ажно чатыры тытулы. Тры разы лепшым прызнаваўся Уладзімір Цыплакоў, па два — Андрэй Скабелка і Руслан Салей. Ну а найбольш галасоў па выніках сезона 2006/07 сабраў капітан нацыянальнай дружыны і чэмпіёна краіны мінскага „Дынама" Алег Антоненка. Вынікі плебісцыту не выклікалі сумневаў загадзя — гульня Антоненкі на чэмпіянаце свету не пакідала альтэрнатывы. У выніку ён набраў 616 балаў і апярэдзіў бліжэйшага канкурэнта ажно на 407 пунктаў. Застаецца дадаць, што Алег у міжсезонне, якое наступіла, памяняў клуб — цяпер ён будзе выступаць за маскоўскую каманду МВД. Другім па выніках рэферэндуму названы форвард Аляксей Калюжны, які выступае ў расійскай суперлізе за омскі „Авангард" — у яго 209 ачкоў. Не застаўся незаўважаным і прарыў нападніка Андрэя Касціцына ў „Манрэаль" — са 142 баламі ў яго 3-е месца. Тройка магла выглядаць і інакш — ужо пасля правядзення апытання стала вядома, што Міхаіл Грабоўскі ў складзе „Гамільтана" стаў пераможцам Кубка Колдэра — другога пасля Кубка Стэнлі па значнасці трафея.

Лепшы хакейны трэнер вызначаўся толькі чацвёрты раз. Да гэтага прызнання заслугоўвалі Міхаіл Захараў (у 2004 і 2005 гадах) і Глен Хэнлан (летась). Цяпер галоўным дыпламантам стаў настаўнік сталічнага „Кераміна" і юнацкай зборнай краіны Андрэй Гусаў. Самае цікавае, што Гусаў зусім нядаўна завяршыў гульнёвую кар'еру, а мінулы сезон быў для яго ўвогуле дэбютным. Другое месца заняў Міхаіл Захараў, які трэніруе „Юнацтва-Мінск", трэцяе — былы рулявы мінскага „Дынама" славак Любамір Покавіч, якому падчас сезона даволі нечакана далі адстаўку.

Куды цяжэй было вызначыць лепшых у баскетбалістаў. Галоўная складанасць палягала ў тым, што на некаторыя пазіцыі прэтэндавала багата чалавек, а на іншыя даводзілася шукаць вартых „з ліхтарыкам". У выніку сімвалічная зборная выглядае так — Дзмітрый Кузьмін, Уладзімір Шарко (абодва „Віталюр"), Георгій Кандрусевіч (асіповіцкі АЗАА), Канстанцін Яфрэмаў („Гродна-93"), Канстанцін Яроменка („Віталюр"). Акрамя расійскага цэнтравога Яроменкі ўсе астатнія беларусы. Асноўнае змаганне за тытул MVP было паміж аднаклубнікамі Кузьміным і Шарко. У выніку крыху больш рэспандэнтаў назвалі лепшым плэймейкера нацыянальнай зборнай Кузьміна. На званне мацнейшага мог прэтэндаваць і лепшы снайпер рэгулярнага першынства Кандрусевіч, але ў паўфінале яго клуб саступіў дарогу „Гродна-93", што істотна паўплывала на галасаванне. Ну а лепшым трэнерам другі год запар прызнаны Міхаіл Фейман, які трэніраваў у гэтым сезоне гродзенцаў. „Гродна-93" хоць і заваявала толькі срэбра, але навязала ў фінале „Віталюру" зацятае „перацягванне каната". Відаць гэта і паўплывала на рашэнне гаспадара чэмпіёна зноў вярнуць у шэрагі „Віталюра" Феймана, які заменіць Аляксандра Барысава — у выніку адбылася ракіроўка наадварот. Вельмі верагодна (і крыху забаўна ў такой сітуацыі!) Барысаў можа вярнуцца на капітанскі мосцік гродзенскага „карабля". Што тут казаць — дэфіцыт кваліфікаваных баскетбалістаў і трэнераў у Беларусі відавочны.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Свята ў Чаромсе

Пасвячэнне пажарнай заставы ў Чаромсе, якое адбылося 2 чэрвеня, лічылася імпрэзай павятовага рангу і было прымеркаванае да святкаванняў Дня пажарніка. У мерапрыемстве ўдзельнічалі былы камендант Ваяводскай камендатуры пажарнай аховы ў Беластоку генерал Багдан Калакоўскі, выконваючы абавязкі ваяводскага каменданта брыгадзір Ян Градкоўскі, камендант Павятовай камендатуры пажарнай аховы ў Гайнаўцы Яраслаў Трахімчык, гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук, праваслаўны ардынарый Войска Польскага епіскап Міран, генеральны вікарый Драгічынскай епархіі ксёндз-прэлат Станіслаў Улячык ды святары і прадстаўнікі шматлікіх устаноў Гайнаўшчыны. З Беларусі на святкаванні прыехалі намеснік начальніка Раённага аддзялення па справах надзвычайнага становішча ў Камянцы Уладыслаў Дучэўскі і такога ж рангу прадстаўнік Пружан Баляслаў Андрушка. Мерапрыемства пачалося а 13-й гадзіне паўгадзінным набажэнствам у касцёле, затым удзельнікі перайшлі ў праваслаўную царкву на святочную літургію. Адтуль сабраныя падаліся на вуліцу Бочну пад будынак заставы, дзе працягваліся далейшыя ўрачыстасці.

Фота МІРАСЛАВА КЕРДАЛЕВІЧА

Цырымонія пасвячэння аўтамабіляў

Цырымонію пасвячэння заставы, як і двух новых пажарных аўтамашын здзейснілі епіскап Міран і ксёндз-прэлат Станіслаў Улячык. Варта адзначыць, што чаромхаўскія пажарнікі атрымалі ад Павятовай камендатуры ў Гайнаўцы новы гідраўлічны дамкрат (са стралой да вышыні 25 метраў), а машыну „Стар-266" для пажарнікаў з Кляшчэль купіла мясцовая гміна з уласнага бюджэту. Затым былі зачытаны прозвішчы 5 пажарнікаў, якія атрымалі павышэнні па службе. Дваццаць пяць пажарнікаў — прафесійных і добраахвотнікаў — было ўзнагароджаных залатымі, сярэбранымі ды бронзавымі адзнакамі за заслугі для пажарнай справы. Ганаровы медаль імя Баляслава Хаміча атрымаў Рыгор Васілюк з Чаромхі-Станцыі. У святкаваннях удзельнічалі ганаровы ўзвод са сцяганосцамі Добраахвотнай пажарнай каманды з Кляшчэль і духавы аркестр Комплекса водна-меліярацыйных школ з Беластока, а таксама маладзёжныя каманды пажарнікаў з Гайнаўкі і Кляшчэль.

У мастацкай частцы выступіў гурт „Чарамшына", а духавы аркестр, які падыгрываў у час імпрэзы, паказаў парадную муштру. Хоць надвор'е паскупіла сонечных прамянёў, а вецярок астуджваў твары, аднак многім чарамшанам не перашкодзіла гэта прысутнічаць на святкаваннях. Варта было пабываць на чаромхаўскай імпрэзе хаця б дзеля таго, каб пакаштаваць... смакавітага пажарніцкага гарохавага супу (выдаваўся ён бясплатна).

Уладзімір СІДАРУК

Вёска з (к)раю

У Валілы заглядаю ў летні спякотны дзень, калі здаецца, што наша Сонейка асабліва шчыра дорыць нам багатую долю ад сваіх распаленых градусаў. Быццам у высокай стратасферы нехта павесіў над вёскай выпуклую лінзу, якая тых градусаў збірае яшчэ больш, чым належыцца з высокіх высот. А на вуліцы, калі б хто паклаў на яе белую фарбу, насціл выглядаў бы як у сіверную зіму, ачышчаны магутным адвалам ад снегу — такая менавіта фактура вулічнага палатна адкрылася перада мною. Па вуліцы вёскі Валілы праехаў грэйдэр. У Валілах вуліца не мае цвёрдага насцілу. Асфальтавы насціл на шашы са Случанкі ў Залукі, якая пралягла навонкі, за загуменнем Валіл. Асфальтавы насціл на шашы з Беластока да пагранперахода ў Баброўніках, якая пралягла яшчэ два кіламетры далей. Такім чынам пра Валілы можна сказаць, што гэта вёска з краю, двойчы з краю.

Кіруюся на салтысоўскі панадворак. Гаспадара акурат няма дома, затое ж ёсць аж дзве гаспадыні і суседка. Запрашаюць мяне за столік у цянёчку. Такіх цянёчкаў цяпер шмат па вёсках. Калісь па вёсках не было часу сядзець пад цяньком, у летні гарачы час трэба было завіхацца на сенажаці, згодна запавету пасля выгнання з раю: „З нялёгкай працы будзе твой хлеб”. Цяпер наша вёска быццам вяртаецца зноў у рай, дзе пад яблынькамі цянёчак, на панадворках заміж утрамбаванай капытамі зямлі роўненька падстрыжаная траўка. І ўласнікаў капыт няма і маладому пакаленню складана будзе цяпер уявіць нават, як бы мог выглядаць Ноеў каўчэг.

І разведку пра вёску пачынаю я з вясковай тэмы. Гэту вясковасць я яшчэ сузіраю па-нядаўняму, бо пацяперашняму яна ўжо можа выглядаць інакш. Пытаю сваіх суразмоўцаў пра той жывёльны свет, які яшчэ на вёсцы астаўся.

У Валілах дзве вялікатаварныя малочныя гаспадаркі; з аднае малако забірае Саколка, з другой — Бельск. І лічаныя гаспадары трымаюць па дзве-тры кароўкі, ад якіх сырадой здаюць у пункт прыёму, што ў Залуках. У вёсцы разам пяцёра коней і жарабят, і ніводнай авечкі, ні казы. Ёсць крыху гусей, крыху курэй і свіней — сабе. Калісь гусей трымалі хата ў хату, бо ж трэба было падушкі і пярыны рабіць — сабе, і дзецям выпраўляць. Адна з гаспадынь інфармуе мяне, што мае крыху курэй з інкубатара, а крыху ад квактухі. Апошняя вестка мяне асабліва зацікавіла, бо ж, здаецца, і слух прападае, што куранят куры выводзяць. І сапраўды, куры разгультаіліся быццам людзі, і ў іх з пракрэацыяй справа дрэнь. Гаспадыня пасадзіла дзве квактухі: пад адну паклала 17 яек, з якіх выдзеўблася сямёра куранят, пад другую паклала 15 яек і атрымала 6 куранят. А калісь з усіх яек выклёўваліся маладыя...

І лён калісь вырошчвалі, і авечак гадавалі, пражу пралі і тканіны ткалі. Але не ўсё самі ткалі, напрыклад, дываны вазілі ткаць аж за Заблудаў, у Козлікі. А зараз і мала хто вырошчваннем займаецца. Трава кароўкам сама расце на сенажацях, што з аднаго боку Валіл, у даліне ракі Супраслі. А з другога боку крыху поля абсеянага, якое абрабляе гаспадар з Двара, колішняга пэгеэра, які трымае шмат жывіны. Жыхарам Валіл клопат з назвай суседняга пасялення — раней трэба было прывыкаць да „пэгеэра”, цяпер ад яго трэба адвыкаць у карысць „двара”.

У Валілах зараз жыве за сто душ, у тым ліку пяць г.зв. маладых сем’яў. У вёсцы каля дваццаці дзяцей, якія ўсе вучацца не ў суседніх Залуках, але ў гмінным Гарадку; так завялося з самога пачатку, г.зн. ад ліквідацыі мясцовай школы.

Бруку ў Валілах няма; войт абяцае, што за год валілаўская вуліца атрымае асфальт. А пакуль падсыпалі крыху жвіру, які ў „мой” дзень расцягнуў грэйдэр. Водаправод працуе ўжо каля пятнаццаці гадоў. Пра каналізацыю пакуль гаворкі няма, яна дарагая. Войт прапануе аднаасобніцкія ачышчальні нечыстот з дафінансаваннем з еўрафондаў.

І стацыянарнай крамы ў Валілах няма, затое ездзяць сюды дзве аб’язныя, абедзве тройчы ў тыдзень. Адна, з Нараўкі, возіць толькі хлеб, другая, з Васількава, усе харчовыя прадукты. Стацыянарныя крамы ёсць у суседніх Двары і Залуках; ну і ў Гарадку. У Гарадку і сямейны лекар, калі трэба, то і дадому можна яго выклікаць. І „Caritas” уколы робіць.

У Валілах ціха, спакойна. Бо і людзі тут добрыя, ціхія. Старэйшыя на пенсіях, якія выпрацавалі хто на полі, хто ў пэгеэры, хто ў цэпээне, хто ў меліярацыі, хто дзе. І малодшыя мусяць круціцца, каб работу мець: у лесе працуюць альбо ў фірмах. Можна ўхапіцца і за сезонную працу, напрыклад пры пасадцы лесу. А летам і восенню дарабляць у Кнышынскай пушчы, што раскінулася ўжо за рэчкай — збіраць на продаж грыбы і ягады. Як у раю, дзе ж хіба таксама не адны толькі яблыкі вырасталі.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

ШЛЯХАМ СТАРАВЕРАЎ

Наш тэатр „Diochy” з’ездзіў у Кадзідлова пабачыць тамашні Культурны пасёлак, памятку па пражываючых калісь у Пішскай пушчы стараверах.

Стараверы пасяліліся тут у некалькіх мясцовасцях, уцякаючы ад рэлігійнай неталерантнасці ў Расіі. Прышэльцы высякалі лес пад свае пасяленні. Найперш паўстала вёска Ануфрыева, а пасля Вайнова, якое і сталася іх галоўным рэлігійным цэнтрам. Далей узніклі вёскі Кадзідлова, Асінак, Ладнэ Поле, Замочак, Пяскі... Усе гэтыя мясцовасці ў наваколлі вёскі Укта, нападалёк прыгожай рэчкі Крутыні ў гміне Руцянэ-Ніда, што ў Пішскім павеце Варміска-Мазурскага ваяводства, стваралі пасяленчы комплекс з адметнай культурай. У гэтай адносна невялікай калоніі існавалі тры манастыры; два з іх — у Ануфрыеве і Майдане, згарэлі. Манастыр у Вайнове, над возерам Дусь, быў пабудаваны ў 1847 годзе: спачатку жылі ў ім манахі, а з 1884 года — манашкі. Гэты манастыр існаваў да 1987 года; зараз гэты асаблівы стараверскі комплекс могуць наведваць турысты. У цэнтры Вайнова ў 1840 годзе была пабудавана драўляная малельня, якая згарэла ў пачатку XX стагоддзя; на яе месцы ў 1921 годзе была ўзведзена новая, мураваная малельня.

Стараверскі манастыр у Вайнове

У XX ст. сярод стараверaў узнік раскол, частка з іх далучылася да Праваслаўнай царквы і ў 1922 годзе ў Вайнове была пабудавана драўляная царква і мураваная плябанія.

Першым стараверскім перасяленцам ва Усходнюю Прусію быў Ануфрый Смірноў родам з Віцебскай губерні, які пераехаў на новае месца 7 чэрвеня 1830 года; гэта ў яго гонар наступныя пасяленцы назвалі сваю вёску Ануфрыевам. Галоўным заняткам стараверaў стала земляробства. Найчасцей у Прусію перасяляліся стараверы, якія дагэтуль жылі ў Сувальскай губерні. Шмат стараверaў прыехала і з іншых губерняў: з Віцебскай, Віленскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Пскоўскай, Ноўгарадскай, Ніжненоўгарадскай, Цвярской, Смаленскай, Маскоўскай, Жытомірскай, Варонежскай... Да збудавання першых малельняў стараверы маліліся ў асобных хатах, прыстасаваных для малітоўных мэтаў. У 1860-1868 гадах у Пішы дзейнічала стараверская Славянская тыпаграфія. Нягледзячы на адмову стараверaў ад вайсковай службы, першы іх прызыў адбыўся ў 1843 годзе; адзінай уступкай у іх карысць было захаванне барады. У нямецкім войску стараверы былі вельмі сумленнымі салдатамі.

Культурны пасёлак у Кадзідлове складаецца з пяці драўляных будынкаў, узведзеных калісь стараверамі: трох хат і двух свірнаў, перанесеных сюды з навакольных вёсак. Пабудаваны яны былі з дыляў і з’яўляюцца выразнай адметнасцю на фоне навакольнай архітэктуры; у хатах рэстаўрыраваны не толькі іх ранейшы вонкавы выгляд, але і колішні інтэр’ер.

Добра пабачыць цікавыя гістарычныя памяткі. І іншыя вёскі з традыцыйнай забудовай таксама павінны быць ахоплены аховай, бо з’яўляюцца важнымі доказамі гісторыі, кампанентамі культурнай спадчыны. Гэтак жа культурную спадчыну трэба ахоўваць і на Беласточчыне, захоўваць беларускасць нашых вёсак.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 001 egz.

ДА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАСЦІ ГАЙНАЎШЧЫНЫ

Panie Przewodniczący, Wysoka Rado, Panie Burmistrzu.

Wnioskuję o skreślenie z porządku obrad punktu 9 C w sprawie wyrażenia zgody na wprowadzenie pomocniczego języka białoruskiego przed organami gminy.

Uzasadnienie

Mam świadomość (wbrew opinii niektórych radnych, iż ta uchwała nie ma żadnego znaczenia), że jest to najważniejsza uchwała przy jakiej uczestniczyłem w czasie poprzedniej i obecnej kadencji.

Wpływa ona bowiem na stosunki międzyludzkie, międzysąsiedzkie, zaostrza antagonizmy narodowościowe, wyznaniowe, zamiast łączyć społeczeństwo — dzieli je.

Moim zdaniem nawet uchwały w sprawie budżetu są mniejszej wagi, budżet można przecież na następnej sesji znowelizować, dostosować również do aktualnych potrzeb plan zagospodarowania przestrzennego. Podatki obejmują zaś wszystkich mieszkańców i nikogo nie dyskryminują.

Ja w przeciwieństwie do niektórych radnych, mających mniemanie, że wiedzą lepiej co oczekuje od nich społeczeństwo przeprowadziłem prywatny sondaż. Rozmawiałem z wieloma — około 200 mieszkańcami, w tym także z osobami duchownymi. Jedynie kilka osób uważało, że pomysł wprowadzenia języka białoruskiego czy nazw jest warty rozważenia, nikt nie poparł tego pomysłu, pozostałe osoby powiedziały kategorycznie — nie.

Nie można powiedzieć, że obecnie mniejszości narodowe są w naszym mieście w jakiś sposób dyskryminowane. Burmistrz organizuje wiele różnych imprez tzw. białoruskich czy ukraińskich, mogą też te osoby należeć do różnych stowarzyszeń.

Zwracam się z pytaniem do Pana Burmistrza i Państwa Radnych czy znany jest im fakt nie załatwienia jakiejś sprawy w Urzędzie Miasta dlatego tylko, że petent nie umiał przedstawić swojej prośby wskutek nieznajomości języka polskiego?

Ja nie jestem wrogiem tzw „białoruskości". Swoich synów nauczyłem mówić dialektem — jak nazywam — parafii dubińskiej, nauczyłem ich też cyrylicy, sam zaś bardzo często używam tego dialektu.

Jestem osobą bardzo tolerancyjną. Bardzo przychylnie bym patrzył na wnioskodawców uchwały z Białoruskiego Klubu Radnych na to, aby do podkreślenia swojej „białoruskości" oraz dla propagowania i promocji „białoruskości" przynajmniej na zebrania Rady Miasta przychodzili na przykład w ludowych strojach białoruskich. Myślę, że haftowaną lnianą „rubaszkę przepasaną sznurkom", haftowane „nohawicy", łapcie czy „czoboty" można znaleźć w domu, dać do wyhaftowania żonie lub w ostateczności wypożyczyć w HDK.

Poza tym — kto z mieszkańców naszego miasta potrafi rozmawiać czy pisać po białorusku? Czy jeżeli jakiś podatnik napisze podanie po „swojemu" to czy będzie ono rozpatrywane — nie będzie wszak to literacki język białoruski.

Teraz kwestie budżetowe: kto i z czego zapłaci przysięgłemu tłumaczowi języka białoruskiego, którego przecież trzeba będzie zatrudnić w Urzędzie Miasta? Przykład — duży inwestor planujący wybudować w mieście jakiś zakład. Pisze w związku z tym podanie w języku białoruskim i trzeba mu dać odpowiedź w tym języku pełnym technicznych określeń. Z całym szacunkiem, ale nawet najlepsi absolwenci naszego LO z dnjb nie sprostają takiemu zadaniu.

Oczekuję też pisemnej odpowiedzi od Pana Burmistrza jak po ewentualnym wejściu w życie przedmiotowej uchwały będzie prowadzona polityka kadrowa w Urzędzie Miasta i jemu podległych podmiotow: spółek miejskich, szkół, biblioteki, HDK, OSIR. Czy Pan Burmistrz będzie musiał na wszystkie te stanowiska dobierać wyłącznie absolwentów Liceum Ogólnokształcącego z Białoruskim Językiem Nauczania? Czy będzie musiał hołdować zasadom i powiedzonkom rodem jeszcze z PRL?

I parafrazując:

„dobry fachowiec ale bezpartyjny" na „dobry fachowiec, ale nie zna języka białoruskiego"

oraz „mierny, bierny ale wierny" na „mierny, bierny ale zna język białoruski".

Dlatego zwracam się do szanownej Rady Miasta o skreślenie z porządku obrad punktu 9 C. Ewentualnie wnoszę o odrzucenie przedmiotowej Uchwały, bo poza kilkoma białoruskimi nacjonalistycznymi działaczami niczego dobrego ona naszemu miastu nie przyniesie, na pewno ona nie jest potrzebna naszym wyborcom.

Łączę wyrazy szacunku
Radny:
Bołtromiuk Eugeniusz

Гайнаўка 21.06.2007 г. (рэд.)

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. ручное прыстасаванне з пласцінак у выглядзе складнога паўкруга, якім абмахваюцца ў духату = 27 _ 28 _ 16 _ 17 _;
2. змацоўвае аглоблі з хамутом = 32 _ 33 _ 1 _ 21 _;
3. жыхарка Эдэма = 36 _ 9 _ 35 _;
4. вялікая колькасць сыпкага рэчыва, жывёл, прадметаў = 30 _ 31 _ 29 _ 26 _;
5. серабро ў пары з залатым маўчаннем = 22 _ 4 _ 3 _ 2 _;
6. аргенцінскі стэп = 13 _ 14 _ 34 _ 23 _ 25 _;
7. доўгае паглыбленне выкапанае ў зямлі або моцны працяглы крык некаторых жывёл = 24 _ 10 _ 11 _;
8. драпежная млекакормячая жывёліна сямейства кашэчых або спосаб бегу каня = 5 _ 6 _ 20 _ 8 _;
9. сасок у млекакормячых жывёлін = 7 _ 18 _ 15 _ 12 _ 19 _.

(ш)

	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25
		26	27	28	29	30	31	32	33	34	35	36

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 21 нумара

Печыва, румянец, Ітака, дружка, сяло, патрыярх.

Рашэнне: **Ружовыя акуляры.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

01.07 – 07.07

Баран (22.03. — 20.04.) Хтосьці хоча табе памагчы — хай стараецца, іншыя таксама хочуць даваць. Жыццё вымусіць на табе змену планаў і большы высілак. Калі страціў ты давер партнёра, пастараешся вярнуць ідылію.

Бык (21.04. — 21.05.) Росквіт лета ў тваім сэрцы. Адважна возьмешся за выклікі, якія здаваліся табе яшчэ нядаўна непераадольнымі. Сілы падмацуюць людзі, якія дзейнічаюць можа не надта элегантна, ды з поспехам (пільнуй, абы не супраць закону).

Блізняты (22.05. — 22.06.) Зробіш малы перападлік у сваёй душы, ды замест у банк, пойдзеш да... варожкі. На працы не рабі нічога на цяп-ляп, пільнуй таксама, каб усё было згодна з законам. Мары аб духоўным адраджэнні, жыцці згодным з натурай і рытмамі космасу.

Рак (23.06. — 23.07.) Энергія, аптымізм, новыя ідэі. Хтосьці можа табе моцна закружыць у галаве (асоба вельмі энергічная, ды такія будуць табе падабацца). Хтосьці можа запрапанаваць табе ўдзел у групавай імпрэзе (праца, інтарэсы, выезд за мяжу) — добра перадумай справу: саламяны агонь можа ахапіць і тваіх сяброў.

Леў (24.07. — 23.08.) Ад лішку эмоцый можа аж закружыцца ў галаве! Ідуць новыя эмоцыі і пачуцці. Дабрадзейная энергія з космасу, добрыя кантакты з атачэннем. Калі наракаў ты на лёс, усё пойдзе ў лепшым напрамку.

Дзева (24.08. — 23.09.) Ваўка ў авечай шкуры можаш лёгка палічыць сваім прыхільнікам. Пільнуйся! Можаш мець уражанне, што справы ўцякаюць з-пад кантролю і туман завалакае дарогу, па якой ідзеш — можа табе здавацца, што заблукаўся, ды гэта якраз ты перастаўляць будзеш жыццё на іншыя пуці. Пасябруй з Рыбамі.

Шалі (24.09. — 23.10.) Пара паказаць кіпцікі. Лагода і падданасць гэта не пашпарт у сужонскае шчасце. Пагодлівыя дні, ды не будзеш вылежвацца жыватом уверх. Новыя заданні, але і шмат энергіі. Можа, больш чым займацца сваімі, будзеш абараняць інтарэсы калегі.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Пры праблемах партнёр, сям'я і сябры стануць за табой муром. Жыццё на поўную катушку, ды абыдзецца без прыкрых неспадзяванак. Ды не працуй над свае сілы, ноччу спі. Пры рамонце і ў падарожжы пільнуйся, каб не параніцца.

Стралец (23.11. — 22.12.) Спрыяе табе Сонца! Згода дома, лепшае здароўе, настрой. Ды справы замены жылля ці працы адкладзі на пасля. Пры падпісванні дамоў (калі ўжо мусіш), дакладна ўзірайся ў тое, пад чым падпісваешся. У інтарэсах асцерагайся Блізнят і Дзевы.

Казярог (23.12. — 20.01.) Мноства выдаткаў! Ну, што ж, змена іміджу каштуе — добры цырульнік, касметыка, шматкі каштуюць нямала. Ды варта! Часу мала, прыбудзе заняткаў, а да спраў, якія марудна валакліся, трэба будзе прыкласціся. Наракаў на нуду і застой — аж стомішся ад змен!

Вадалей (21.01. — 19.02.) Сам Юпітэр задбае, каб у тваёй працы былі поспехі і грошы! Дні сімпатычныя, ды без вялікіх уражанняў. На сэрцы лёгка і радасна. Вакол сімпатычныя людзі. У прыватным жыцці спадзявайся на лёс і інтуіцыю.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Нуда не мае да цябе доступу. Калі адчуеш слабасць, памогуць мінералы і вітаміны; пацікаўся ёгай. Шмат карэспандэнцыі і вестак (урэшце ж паадпісвай!). Новыя знаёмствы (хутчэй не выйдуць па-за межы сяброўства).

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960